

ІДЭІ, ЯКІЯ НЕ ПАКІДАЮЦЬ РАЎНАДУШНЫМІ НІКОГА

ЧЫРВОНКА

З ЯКІМІ ДУМКАМІ ЖЫВЕ І ПРАЦУЕ МАЛАДЫ ЗААТЭХНІК У ВЁСЦЫ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЛЮТАГА 2022 г. ЧАЦВЕР № 37 (29659)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«У Год гістарычнай памяці мы хочам актывізаваць работу з мемарыяламі і помнікамі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне. У планах — не проста падтрыманне такіх аб'ектаў у належным выглядзе, але і рэканструкцыя помнікаў, якія час не пашкадаваў. Наша задача — захаваць месцы воінскай славы. Святы абавязак кожнага беларуса — памятаць пра подзвіг сваіх дзядоў і прадзедаў. Важна перадаць гэтую памяць наступным пакаленням, выхаваць сапраўдных патрыётаў, якія і далей будуць гарантаваць бяспеку краіны і захаваюць памяць аб не адным пакаленні воінаў, якія сваім жыццём заплацілі за магчымасць жыць у незалежнай краіне, так, як марыць жыць любы народ, — на сваёй зямлі і з упэўненасцю глядзець у будучыню».*

# Будучыня ў нашых руках



Фота БелТА.

У Віцебскім дзяржаўным каледжы электратэхнікі адкрылася новая сучасная лабараторыя электрычных вымярэнняў. Праект ажыццяўляецца ў рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021—2025 гады.
**На здымку**: будучыя тэхнікі-электрыкі Ягор АКУЦЁНАК і Уладзімір ШЧАПЯТКОЎ.

## КОРАТКА

- **Павышаць цэны на цыгарэты ў Беларусі з 1 сакавіка не плануецца, паведаміла Міністэрства па падатках і зборах.**
- У 2021 годзе экспарт харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны павялічыўся да 2020 года на 17,3 працэнта і дасягнуў $6,7 млрд. У выніку за год забяспечаны прырост каля $1 млрд. Дадатнае знешнегандлёвае сальда склала $2,2 млрд.
- **У Беларусі ў 2021 годзе на фінансаванне аховы здароўя было выдзелена больш як Br8 млрд.**

Вайна пад стрэхамі

## ТРАГЕДЫЯ І БОЛЬ ВЁСКІ ГАІ

### У Магілёўскім раёне збіраюцца ўшанаваць памяць партызанскіх сувязных



Магілу Ядвігі Бардзілоўскай паставілі на ўлік як воінскае пахаванне.

**Гаі — вёска на паўночным ускрайку Магілёва. Адтуль нават можна ўбачыць дах чыгуначнага вакзала. Да вайны гэта быў невялічкі пасёлак, зараз на месцы старых дамоў будуюць катэджы магіляўчане. Тут вельмі прыгожа. Маляўнічыя ўзгоркі і равы, побач лес, рачулка і лагодная для сэрца цішыня. У гарачым 1941-м усё было па-іншаму. Тут рубяжы горада абараняў легендарны міліцэйскі батальён пад камандаваннем капітана Канстанціна Уладзімірава, у які ўваходзілі і зусім яшчэ зялёныя курсанты. Амаль усе яны палеглі на гэтай вышыні. Сёння яна абазначана вялікім мемарыяльным комплексам, нашчадкі берагуць памяць пра абаронцаў. Але ў нас не так шмат памятных месцаў, дзе пахаваны мірныя жыхары. Іх смерць часам была не менш жахлівай і пакутлівай. У вёсцы Гаі яшчэ жывуць сведкі тых нечалавечых акцый застрашвання і забойства сялян. Ад іх расповедаў мурашкі па спіне. Ім ужо далёка за восемдзесят, і яны спяшаюцца засведчыць перад нашчадкамі, як гэта страшна, калі ў дом грукаецца не віртуальная, а рэальная вайна.**

СТАР. 13

Спажывец

## ДАЧНІКІ РЫХТУЮЦЦА ДА ПАСЯЎНОЙ

### Насенне і садовы рыштунак: што пачым у новым дачным сезоне



**Цяжка паверыць, але вясна ўжо не за гарамі. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова наведаць крамы для агароднікаў-садаводаў: там ужо ў разгары бойкі гандаль. Мы вырашылі пабываць у адным з найбуйнейшых сталічных гандлёвых цэнтраў, дзе прадаюцца насенне і садовы інвентар, і даведацца, колькі сёлета давядзецца ўкласці ў соткі, каб атрымаць ураджай.**

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

# НАРОД ВЫЗНАЧАЕ СВОЙ ЛЁС

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на адным з выбарчых участкаў сталіцы, дзе паназіралі за ходам галасавання

**Учора з раніцы на выбарчым участку № 5 Мінска было нешматлюдна. Бліжэй да абеду людзей пабольшала. Як паведаміў намеснік старшыні выбарчага ўчастка № 5 Цэнтральнага раёна Павел НЯМКОВІЧ, дастаткова нядрэнная яўка была ў аўторак, у першы дзень датэрміновага галасавання.**

«Прыйшлі 37 чалавек, што склала амаль 5 % ад грамадзян, якія ўнесены ў спісы, — заўважыў прадстаўнік участковай камісіі. — Як паказвае практыка, у датэрміновым галасаванні ўдзельнічае каля 40 % выбаршчыкаў. Большасць грамадзян прыходзіць на ўчастак у асноўны дзень галасавання».

Паколькі падчас рэферэндуму выбарчы ўчастак памяняў месца дыслакацыі, была праведзена вялікая папярэдняя работа па інфармаванні жыхароў, якія да яго адносяцца, аб новым размяшчэнні. Пакуль ад тых, хто прагаласаваў, як паведамілі члены выбарчай камісіі, не паступіла ні адной заўвагі наконт пераносу ўчастка.



Да тых, хто па аб'ектыўных прычынах не можа прыняць удзел у галасаванні, але жадае выканаць свой грамадзянскі абавязак, у асноўны дзень галасавання, 27 лютага, прадстаўнікі ўчастковай камісіі прыедуць дамоў. Такія просьбы ў выглядзе заявак ужо паступаюць у камісію. Выезд на дом прадугледжаны да пажылых грамадзян, інвалідаў, а таксама хворых на каранавірусную інфекцыю. «Каб не дапусціць захворвання ў членаў камісіі, у Цэнтральным раёне арганізаваны спецыяльныя групы, якія будуць выязджаць на дом, — удакладніў Павел Нямковіч. — Яны забяспечаны ўсімі неабходнымі сродкамі індывідуальнай абароны».

Выконваюцца эпідэміялагічныя меры і на самім участку галасавання. У зале ўстаноўлены дэзынфектары для апрацоўкі рук, каму неабходна, выдаюцца маска і пальчаткі. Акрамя таго, у памяшканні, дзе адбываецца галасаванне, кожныя дзве гадзіны праходзіць вільготная прыборка. Ручкі, а таксама іншыя паверхні апрацоўваюцца спецыяльнымі сродкамі.

На ўчастку працуе 10 нацыянальных назіральнікаў. «Што датычыцца работы выбарчай камісіі, ніякіх заўваг няма, — адзначыў **назіральнік Сяргей ХІНЕВІЧ.** — Аднак магу заўважыць, што і людзей мала».

Суразмоўнік кажа, што ў назіральнікі пайшоў па ўласнай ініцыятыве. Падобнага вопыту мужчына дагэтуль не меў, падчас гэтай выбарчай кампаніі, звязанай з рэферэндумам па Канстытуцыі, вырашыў, што не можа быць убаку ад гэтай найважнейшай палітычнай падзеі. «Я неабыякавы да таго, што адбываецца ў нашай краіне, падзяліўся ён. — Мне не ўсё роўна, што адбываецца цяпер, а тым больш, што будзе потым».

Як лічыць выбаршчыца Тацяна Маскалік, нельга быць абыякавым да рэферэндуму па Канстытуцыі. «Гэта наша будучыня, — кажа жанчына. Канстытуцыя — закон, па якім мы жывём. У нас ёсць дзеці,



унукі, і хочацца, каб у іх усё было добра. Гэта ўжо рашэнне людзей — прагаласуюць яны «за» ці «супраць», але прыйсці на выбарчы ўчастак павінен кожны грамадзянін Беларусі».

— Я прыйшла на галасаванне, бо так лічу патрэбным асабіста для сябе, — паведаміла карэспандэнту Клаўдзія Мінакова. — Я ўсё жыццё была ў перадавіках, хадзіла на ўсе важныя мерапрыемствы, у тым ліку заўсёды выконвала такі грамадзянскі абавязак, як права голасу. Цяперашні рэферэндум не выключэнне.

Па словах выбаршчыцы Вольгі Арэшкінай, у гэты гістарычны момант, у дадзенай палітычнай сітуацыі адзінае правільнае рашэнне — прагаласаваць за змяненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

На сваім участку ўжо аддаў голас і кіраўнік Цэнтрвыбаркама. Як акцэнтаваў увагу ў размове з журналістамі **старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА,** Канстытуцыя — той дакумент, па якім краіна жыве, развіваецца. «Гэта і пэўная сацыяльная палітыка, і пэўная эканамічная палітыка, гэта ў цэлым ідэалогія дзяржавы, дакумент, без якога не можа абысціся ні адна краіна, — перакананы кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — Звяртаючыся да людзей, высвятляючы іх пазіцыю, меркаванне, адносіны, такім чынам дзяржава падкрэслівае далучэнне грамадзян да фарміравання гэтага дакумента. Кожны з нас павінен унесці сваю лепту ў фарміраванне Канстытуцыі, па якой мы будзем жыць. Трэба цаніць тое, што народу прадстаўлена права вызначаць шлях развіцця краіны».

Падводзячы вынікі першага дня датэрміновага галасавання, Ігар Карпенка заўважыў, што ў Цэнтральную камісію не паступала ніякіх заўваг. «Былі звароты, звязаныя з тым, што грамадзяне зарэгістраваныя ў адным месцы, а прагаласаваць хочуць па месцы пражывання, — расказаў ён. — Мы яшчэ раз нагадваем грамадзянам: каб прагаласаваць па месцы пражывання, неабходна прад'явіць дакумент, які пацвярджае іх месца пражывання. Гэта можа быць дагавор найму жылога памяшкання, зарэгістраваны ва ўстаноўленым парадку».

Па словах старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, галасаванне ідзе ў штатным рэжыме. «Сур'ёзных заўваг пакуль няма, — заявіў Ігар Карпенка. — У першы дзень галасавання прагаласавала 6,19 % грамадзян, уключаных у спісы. Мы так і меркавалі, што ў гэтыя дні будзе прыкладна такая яўка. Як правіла, у нас датэрмінова галасуе 30—40 % насельніцтва. Пры гэтым людзі не павінны нікому тлумачыць, чаму яны галасуюць датэрмінова».

Каментуючы спробы пэўных дэструктыўных сіл сарваць рэферэндум, Ігар Карпенка адзначыў, што ёсць адпаведныя артыкулы ў нашым заканадаўстве, якія ў такіх выпадках могуць быць прыменены праваахоўнымі органамі. «Калі нехта з нечым не згодны, то хто перашкаджаў уносіць альтэрнатыўны варыянт Канстытуцыі? — падкрэсліў старшыня ЦВК. — Мы ж убачылі Канстытуцыю не з указа. Мы абмяркоўвалі яе і ў перыяд канстытуцыйнай камісіі, і ў перыяд усенароднага абмеркавання. Кожны мог выказаць свае пажаданні, заўвагі, прапановы. Маральны бок пытання павінен заставацца ў падпарадкаванні тых грамадзян, якія гэтую мараль парушаюць, у тым ліку такімі дэструктыўнымі дзеяннямі».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# БРЭНД УСЁЙ КРАІНЫ

**Свята «Купалле» ў Год гістарычнай памяці злучыць у сабе традыцыі і сучаснасць. Аб гэтым сказаў учора намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні «Купалля» («Александрыя збірае сяброў»), паведаміў карэспандэнт БеЛТА.**



«З часоў свайго станаўлення «Купалле» стала адной з важных культурных пляцовак краіны, што злучае традыцыі і сучаснасць. Мы даўно вызначыліся з агульным фарматам мерапрыемства, які дае магчымасць забяспечыць правядзенне яркай культурнай падзеі. Але нам нельга спыняцца на дасягнутым, тым больш што творчасць — гэта не застылы элемент. Пастаяннае штогадовае пашырэнне фармату свята, яго маштабу, з'яўленне новых выставак, пляцовак, паказаў і выступленняў сведчыць аб існуючым патэнцыяле, які трэба прадэманстраваць і ў гэтым годзе», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Як адзначыў намеснік прэм'ер-міністра, 2022-і — Год гістарычнай памяці, таму тэматыка мерапрыемстваў, пляцовак і галоўнага канцэрта павінна быць звязана з захаваннем памяці аб развіцці і станаўленні як краіны ў цэлым, так і асобных яе населеных пунктаў, арганізацый, а таксама ўкладаў вядомых і простых людзей у гэтыя працэсы. «На святкаванні «Купалля» мы дэманструем розныя гістарычныя элементы, абрады, якія ідуць з глыбіні стагоддзяў», — дадаў ён.

«Свята «Купалле» — гэта не толькі брэнд Магілёўшчыны, Александрыі. Гэта брэнд усёй краіны. На мерапрыемства прыязджаюць замежныя госці, суседзі з Расійскай Федэрацыі (у тым ліку з далёкіх рэгіёнаў — Сібіры, Далёкага Усходу), Украіны, краін Балтыі і акунаюцца ў атмасферу гэтага свята, — акцэнтаваў увагу віцэ-прэм'ер. — На свяце заўсёды шмат моладзі, наведвальнікаў з дзецьмі. Традыцыйна мы запрашаем і дыпламатычны корпус».

Свята ў 2022 годзе плануецца правесці па аналогіі 2021 года — у адзін дзень, пачаўшы работу пляцовак 9 ліпеня (субота) з 11.00 і завяршыўшы начной дыскатэкай 10 ліпеня (нядзеля) у 3.00. Традыцыйна асноўнымі мерапрыемствамі стануць цырымонія адкрыцця, ушанаванне перадавікоў аграпрамысловага комплексу, канцэрты артыстаў эстрады, начная маладзёжная дыскатэка, гала-канцэрт, гандаль на імправізаваных кірмашовых вуліцах.

Акрамя таго, будуць працаваць тэматычныя пляцоўкі, а на кірмашовых вуліцах разгорнуць работу гандлёвыя рады, гульнявыя атракцыёны, цырк-шапіто, выставы-продажы, рэгіянальныя міні-павільёны, сфарміраваныя па відах народных промыслаў і рамёстваў. Асноўным мерапрыемствам стане гала-канцэрт — музычнае падарожжа ў жанры караоке «Вакол Беларусі за адзін канцэрт», які пройдзе на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ААН занепакоены ростам гвалту ў дачыненні да мігрантаў на граніцах Еўрасаюза

Ва Упраўленні ААН па справах бежанцаў (УВКБ) выказалі занепакоенасць узрослай колькасцю выпадкаў гвалту і сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека ў дачыненні да бежанцаў і мігрантаў каля еўрапейскіх граніц, вынікае з апублікаванай заявы. Пра гэта паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. У апошнія месяцы УВКБ рэгулярна атрымлівае паведамленні аб гвалце, жорсткім абыходжанні і затрыманні на сухапутных і марскіх граніцах Еўрапейскага саюза. Гэта адбываецца, нягледзячы на неаднаразовыя заклікі ўстаноў ААН, у тым ліку УВКБ, спыніць падобную практыку. Так, на сухапутных і марскіх граніцах Грэцыі з Турцыяй з пачатку 2020 года УВКБ зафіксавала 540 выпадкаў выправаджэння мігрантаў. Адзначаецца, што трывожныя інцыдэнты фіксуюцца таксама ў Цэнтральнай і Паўднёваўсходняй Еўропе. Апытанні тысяч мігрантаў па ўсёй Еўропе, праведзеныя прадстаўнікамі УВКБ, сведчаць аб пагрозах, запалохваннях, прыніжэннях і прымяненні гвалту. У моры людзей пакідаюць дрэйфаваць на выратавальных плытах, а часам скідаюць проста ў ваду. Не менш страшныя інцыдэнты, паводле звестак УВКБ, адбываюцца і на сухапутных граніцах ЕС.

### У Велінгтане пратэстоўцы ўступілі ў процістаянне з паліцыяй



Удзельнікі акцыі пратэсту ў сталіцы Новай Зеландыі Велінгтане ўступілі ў процістаянне з паліцыяй, трое затрыманы, некалькі супрацоўнікаў паліцыі шпіталізаваны, паведаміла ТАСС са спасылкай на радыёстанцыю Radio New Zealand National. Акцыя праціўнікаў санітарных абмежаванняў і абавязковай вакцынацыі ад каранавіруса прадаўжаецца ў новазеландскай сталіцы ўжо два тыдні. Прэм'ер-міністр Новай Зеландыі Джасінда Ардэрн, якая адмовілася сустракацца з пратэстоўцамі, назвала іх паводзіны «абсалютна ганебнымі» і заклікала пакінуць вуліцы горада. Раней спікер новазеландскага парламента Трэвар Малард заявіў ад імя ўсіх парламенцкіх партый краіны, што ніякага дыялогу з пратэстоўцамі ў Велінгтане не будзе, паколькі іх акцыя выйшла за рамкі закона.

### Моцныя снегапады паралізавалі транспарт на поўначы Японіі



Надзвычайнае здарэнне адбылося на японскім востраве Хакайда. Закрыты міжнародны аэрапорт каля горада Сапара — адміністрацыйнага цэнтра рэгіёна, паведаміла ТАСС. Па даных нацыянальнага грамадскага тэлебачання, тэхніка не паспявае расчышчаць дзве яго ўзлётна-пасадачныя паласы. На Хакайда прыйшлося адмяніць больш за 200 пасажырскіх авіярэйсаў. «Практычна спынены рух па чыгунцы. На аўтамабільных трасах — шматлікія заторы», — адзначаецца ў паведамленні. Як удакладняецца, у шэрагу раёнаў Хакайда зарэгістравана рэкордная колькасць ападкаў. У прыватнасці, у раёне міжнароднага аэрапорта каля горада Сапара за 12 гадзін выпала больш за 40 сантыметраў снегу — гэта максімум за ўвесь час назіранняў.

# «АКТЫЎНАСЦЬ ВЫСОКАЯ»

**Раён, дзе знаходзіцца ўчастак для галасавання № 5 горада Магілёва, — заводскі, тут жыве шмат супрацоўнікаў Магілёўскага металургічнага завода. У першы дзень датэрміновага галасавання тут выканалі свой грамадзянскі абавязак каля 70 чалавек.**



— Для нашага ўчастка, дзе зарэгістравана 2464 чалавекі, гэта добры паказчык, — кажа **старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Людміла ЕЛІСЕЕВА.** — Актыўнасць высокая, і мы задаволены. Шмат хто зайшоў да нас пасля работы. Цяпер эпідабстаноўка неспрыяльная, людзі гэта разумеюць і прыходзяць загадзя, бо непасрэдна ў дзень рэферэндуму можа быць і стоўпатварэнне. Да таго ж, магчыма, у кагосьці іншыя планы на гэтыя выхадныя.

Суразмоўца мае вялікі вопыт работы ў падобных палітычных кампаніях. Дарэчы, старшынствавала падчас рэферэндуму па Канстытуцыі 1994 года. Прызнаецца, што тады быў не менш адказны перыяд у лёсе краіны, і людзі таксама праяўлялі актыўнасць.

**Сакратар камісіі Алеся ЧУМІСАВА** таксама з вопытам, кажа, што ў выбарчых кампаніях удзельнічае каля 20 гадоў. Абедзве супрацоўніцы завода. Людміла Елісеева працуе начальнікам адміністрацыйна-гаспадарчага бюро, Алеся — вядучым эканамістам па збыце.

— Мы і ў палітычных кампаніях разам не першы год, — усміхаецца старшыня камісіі. — Добра ведаем гэты працэс, дакументацыю. Наогул, усе 12 чалавек з нашай каманды — людзі вопытныя, шмат гадоў працуем у адной звязцы.

Першы дзень датэрміновага галасавання прайшоў спакойна. Калі не лічыць таго, што двойчы патэлефанаваў нейкі мужчына і спытаўся: «Гэта выбарчы ўчастак? Вы мне тэлефанавалі?». Алеся дыпламатычна адказала, што ніхто з камісіі яго не турбаваў.

— Пасля 2020 года мы гатовы да ўсяго, — каментуе званок Алеся. — Людзі бываюць розныя.

— Нас перад пачаткам кампаніі збіраў губернатар Анатоль Ісачанка, — адзначыла Людміла Елісеева. — Натхніў, каб нічога не баяліся, што мы цалкам абаронены. Усё пад кантролем, міліцыя напагатове. Паабяцалі, што ўсё будзе спакойна.

Асаблівасць сёлетняй кампаніі — біяметрычныя пашпарты. У мінулую кампанію іх не было.

— Калі прыйдзе чалавек з такім пашпартам з нашага ўчастка, мы яго пагледзім і прапануем прагаласаваць, — кажа Алеся. — А калі яго не будзе ў спісах, але ён скажа, што зарэгістраваны ў нас, звяжамся з міграцыйнай службай, удакладнім.

— А калі прыйдзе, скажам, студэнт, які ўмоўна вучыцца ў Магілёве, а жыве ў Бабруйску? — пытаюся я.

— У нас, дарэчы, у першы дзень такі выпадак быў, — канстатуе Людміла Аркадзьеўна. — Хлопец вучыцца ў МДУ імя Куляшова, жыве ў сваякоў. Мы паглядзелі па пашпарце, дзе прапісаны, звязаліся з камісіяй, дзе ён павінен быў галасаваць, узялі адмацаванне, і малады чалавек прагаласаваў у нас.

У памяшканні, дзе праводзіцца галасаванне, абсталяваны дзве кабіны, плюс больш прасторная для калясачнікаў. Шторак няма, члены камісіі кажуць, што гэта звязана з пандэміяй. Людзі, маўляў, розныя, стан здароўя — таксама, а ўсе бяруцца рукамі за шторку. У наяўнасці празрыстыя урны, ручкі, дэзсродкі, маскі. Урна, якая стаіць пасярод залы, як і трэба, апячатаная. Там пазначаны прозвішчы членаў камісіі. На ноч яе пераносяць у суседні пакой, які знаходзіцца пад аховай.

Усё гатова і для работы з выбаршчыкамі дома. Гэта ў асноўным інваліды, людзі сталага ўзросту і ўсе тыя, у каго ўзніклі непрадугледжаныя абставіны і яны не могуць пакінуць памяшканне. Выключэнне — хворыя на ковід. Да іх будуць выязджаць спецыяльна падрыхтаваныя медыкі. Канкрэтна вядома, што дома будзе галасаваць 80 чалавек, але лічба можа і змяніцца.

— Нам ужо ў першы дзень тэлефанавалі тыя, хто не зможа прыйсці самастойна, прасілі пра іх не забыцца, — удакладняе Людміла Аркадзьеўна.

Для выезду на дом на ўчастку падрыхтаваны тры брыгады. Скрыні, з якімі яны завітаюць да выбаршчыка, празрыстыя. Пакуль яны стаяць убаку, чакаючы свайго часу. У кабінеце старшыні ляжаць аднаразовыя халаты, шчыткі, пальчаткі, дэзсродкі для тых, хто паедзе абслугоўваць выбаршчыкаў. У нядзелю выбарчы ўчастак працуе з васьмі раніцы да васьмі вечара. Да 18.00 будуць прымацца заяўкі ад тых, хто пажадае прагаласаваць дома.

Для тых, хто будзе ўдзельнічаць у важнай палітычнай кампаніі ўпершыню, а гэта моладзь 2003—2004 гадоў нараджэння, БРСМ падрыхтаваў паштоўкі. Няхай застанецца памяць аб першай у жыцці важнай палітычнай падзеі. Усё ж такі не кожны дзень выпадае гонар выказвацца за будучыню сваёй краіны.

За легітымнасцю працэсу на ўчастку сочаць 12 назіральнікаў — прадстаўнікі ад працоўных калектываў, ветэранаў, БРСМ. **Наталля ІСКРОВА** ўпершыню выступае ў якасці назіральніка ад маладзёжнай суполкі. Прызнаецца, што ў мінулую выбарчую кампанію ўдзельнічала ў экзітполе.

— І якія вашы прамыя абавязкі гэтым разам? — пытаюся ў маладой дзяўчыны.

— Назіраць за камісіяй, каб быць перакананай, што яна выконвае ўсе свае функцыі, — кажа яна. — Напрыклад, убачу, што даюць бюлетэнь без пашпарта, зраблю заўвагу. Хачу, каб усё ў нас прайшло законна.

Наталля расказала, што заўсёды ўдзельнічае ў патрыятычных акцыях, летась разам з сябрамі рабіла відэаролік да 9 Мая пра герояў вайны.

— Мой дзядуля Леанід Іскроў — дзіця вайны, — кажа яна. — Ён шмат пра вайну ведае, некалькі кніг напісаў на гэтую тэму, нядаўна выпусціў яшчэ адну. Для яго вельмі важна расказаць нашчадкам праўду.

— Гэты рэферэндум вельмі важны, — лічыць яшчэ адзін назіральнік, **прадстаўнік ветэранскай арганізацыі завода Мікалай КАЗАЧЭНКА.** — Канстытуцыя — менавіта той закон, па якім будуць жыць нашы дзеці, унукі, праўнукі. А мы жадаем, каб яны былі шчаслівыя.

Дарэчы, не абыдзецца і без буфета. Ён размешчаны ў суседнім будынку побач з заводскай сталовай. Гандлёвы пункт працуе пастаянна, але, як там паабяцалі, у сувязі са святам падвязуць пабольш кулінарных прысмакаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

### У тэму

**Старшыня Магілёўскай абласной камісіі па рэферэндуме Валерый БЕРАСТАЎ:**

— З аўторка пачалося датэрміновае галасаванне, у Магілёўскай вобласці запрацавалі 675 участкаў. Усяго ўтворана 707 — разам з тымі, якія знаходзяцца ў медыцынскіх установах. У першы дзень датэрміновага галасавання атрымалі бюлетэні 5 % удзельнікаў рэферэндуму ўнесеных у спісы. У спісы для галасавання ўключана крыху больш чым 792 тысячы чалавек. Галасаванне праходзіць у рабочым рэжыме.

# СВОЙ УКЛАД У АБАРОНУ АЙЧЫНЫ

## Эксперты пра рэферэндум і жыццё пасля яго

**Кампетэнтна аб актуальным — чарговае пасяджэнне «Дэпутацкага клуба» прайшло ў агенцтве «Мінск-Навіны». Эксперты абмяркавалі найважнейшую падзею ў жыцці краіны — канстытуцыйны рэферэндум і далейшую трансфармацыю канстытуцыйных нормаў і заканадаўства. У цэнтры ўвагі таксама — патрыятычнае выхаванне маладога пакалення і адлюстраванне маладзёжнай палітыкі ў Канстытуцыі. У Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл гэта асабліва сімвалічная тэма.**

«Ужо вядома, што за першы дзень датэрміновага галасавання больш за 6 % беларусаў, якія маюць выбарчыя правы, аддалі свой голас. Гэта важна. На мой погляд, гэта ўдвая важна з улікам абвастрэння сітуацыі ва Украіне, з улікам агульнай ваеннай напружанасці каля нашых граніц. Рэалізацыя свайго грамадзянскага права прагаласаваць за новы Асноўны Закон краіны — гэта і ёсць частка вялікага функцыяналу па абароне сваёй Айчыны», — заявіў **генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-Навіны» старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.** Ён падкрэсліў, што сёння важна думаць пра сур'ёзныя змены ў жыцці краіны, якія плануюцца, калі змяненні ў Асноўны Закон будуць прынятыя. Запланаваны змяненні ў сферы адукацыі, аховы здароўя, сацыяльных гарантый грамадзян.

На гэта звярнуў увагу і **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ.** Паводле яго слоў, без рэферэндума, як пункта адліку, далейшы рух наперад у развіцці краіны будзе немагчымы. «У Палаце прадстаўнікоў мы ўжо абмяркоўвалі, што трэба будзе вельмі сур'ёзна дапрацаваць і перагледзець 28 асноўных законаў. Гэта і Закон аб парламенце, аб Савеце Міністраў, аб палітычных партыях, аб грамадскіх аб'яднаннях. Трэба будзе распрацаваць два новыя законы, магчыма, больш. Гэта Закон аб Усебеларускім народным сходзе і Закон аб грамадзянскай супольнасці», — расказаў парламентарый.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святлана ЛЮБЕЦКАЯ** акцэнтавала ўвагу на тым, што Канстытуцыя — гэта аснова ўсяго заканадаўства. Па яе словах, адной з галоўных задач было прадугледзець у праекце Асноўнага Закона тыя механізмы, якія дазволілі б хутка ўплываць і эфектыўна рэагаваць на шматлікія праблемы: «Жыццё сёння вельмі мабільнае і хуткае, і неабходна мець прававы інструментарый і заўсёды дзейнічаць у рамках закона. Гэты пастулат непарушны. Дзяржава гэтага прытрымліваецца. Калі на рэферэндуме народ пагодзіцца са змяненнямі ў Канстытуцыю, людзі прымуць на сябе абавязкі дзейнічаць у рамках закона. Асноўны Закон — гэта агульныя правілы і падыходы, гэта ўніверсальны закон, які ўспрымаецца як асновы жыццядзейнасці грамадства і краіны». Таксама Святлана Любецкая падкрэсліла, што ў самым пачатку тэксту Канстытуцыі напісана: «Мы, народ Беларусі». А значыць, кожны павінен прытрымлівацца прапісаных у гэтым дакуменце нормаў.

У тым ліку, безумоўна, і моладзь. Маладзёжная палітыка сёння — важная частка агульнай дзяржаўнай палітыкі. Удзел у дэпутацкім клубе прынялі і прадстаўнікі маладзёжнага савета пры Мінгарсавеце. «Патрыятычнае выхаванне моладзі — пытанне, якое ўвесь час удасканальваецца. Мы шукаем спецыялістаў новых метадаў працы. У нас прынята праграма патрыятычнага выхавання, у рамках нашай стратэгіі гэты напрамак з'яўляецца першым», — расказаў **другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ.** Гаворачы пра патрыятычнае выхаванне моладзі, ён звярнуў увагу на артыкулы аб захаванні гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, прапісаныя ў праекце Канстытуцыі.

«Мы часта задаёмся пытаннем, хто такі патрыёт. Гэта чалавек, які накіроўвае свае сілы на захаванне суверэнітэту і незалежнасці, хто жадае сваёй Радзіме толькі дабра і робіць кожны дзень асабісты ўнёсак. У кагосьці ён большы, у кагосьці меншы, але менавіта так фарміруецца наша будучыня. Мы хочам захаваць памяць аб кожным, хто ўнёс свой уклад у Перамогу, і павысіць гістарычную адукаванасць моладзі. Для гэтага ў нас ёсць цудоўны праект «Беларусь памятае. Родныя асобы Перамогі», ініцыятыву аб стварэнні нацыянальнага альбома памяці ў 2019 годзе падтрымаў Прэзідэнт. Цяпер у ім звыш шасці тысяч фатаграфій», — расказаў Аляксандр Прохараў.

Як адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ**, наяўнасць у краіне неабыякавых маладых людзей, якія разумеюць, чым жыве грамадства, дарагога варта. Пагадзілася з ім і Святлана Любецкая. «Неабходна падтрымліваць такія ініцыятывы, як Маладзёжны парламент і Маладзёжны савет. Калі мы зможам сфарміраваць такі пласт маладых кіраўнікоў, якія будуць удзельнічаць у прыняцці рашэнняў, нацэленых на жыццё грамадства, у будучыні мы атрымаем выдатных спецыялістаў. На гэта ёсць унутраны запыт. Далучэнне да працы мясцовых саветаў дэпутатаў, да ўдзелу ў выбарчых кампаніях, узаемадзеянне з насельніцтвам, далучэнне да заканатворчага працэсу — моладзь можа закрануць усе сферы жыццядзейнасці дзяржавы. Сёння ў моладзі ёсць запыт, яны жадаюць сябе ў гэтым паспрабаваць. Гэта такі самастойны падыход. Гонар і хвала бацькам, якія заклалі такія задаткі, і гэтым дзецям», — адзначыла парламентарый.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# «ТЫ РАЗУМЕЕШ, ШТО ЗА ГЭТА ЁСЦЬ АДКАЗНАСЦЬ?»

## Як не дапусціць уцягвання моладзі ў наркагандаль

**Праблема распаўсюджвання наркотыкаў і псіхатропаў сярод непаўналетніх выклікае сур'ёзную занепакоенасць не толькі ў праваахоўнікаў, але і ва ўсяго грамадства. Назіраецца сумная тэндэнцыя да таго, як падлеткі са спажыўцоў наркотыкаў становяцца закладчыкамі ці арганізатарамі дылерскай сеткі. Як прадухіліць і вырашыць гэтую праблему, абмяркавалі на круглым стале, ініцыяваным Мінскім гарвыканкамам.**

«Мы запрасілі прадстаўнікоў судовай сістэмы, праваахоўнага блока, сістэмы адукацыі, моладзь паўдзельнічаць у абмеркаванні надзённай праблемы — росту злачынстваў, здзейсненых моладдзю менавіта ў сферы наркагандлю. Мы шмат гаворым пра згубны ўплыў спажывання наркотыкаў, пра розныя формы лячэння і рэабілітацыі. Прыйшоў час пагаварыць пра колькасць злачынстваў, якія здзяйсняюць маладыя людзі. Мы павінны былі яшчэ ўчора вырашыць гэтую праблему. Сёння неабходна разабрацца, як не дапусціць уцягвання моладзі ў наркагандаль», — адзначыла **мадэратар сустрэчы, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА.**

«Мы бачым тэндэнцыю да павелічэння колькасці падобных злачынстваў. Калі ў 2020 годзе былі зарэгістраваны дзевяць непаўналетніх, якія здзейснілі дзесяць злачынстваў (пяць — са збытам), то ў 2021 годзе лічбы прыкметна большыя. Летась за незаконны абарот наркотыкаў да адказнасці прыцягнутыя 33 непаўналетнія, якімі былі здзейснены 33 злачынствы (28 з іх звязаныя са збытам наркотыкаў). Таксама былі прыцягнуты да адказнасці 46 навучэнцаў. У 2021 годзе 14 непаўналетніх дастаўляліся ў медустановы ў сувязі з перадазіроўкай наркотыкамі. Для параўнання: у 2020-м такіх падлеткаў увогуле не было», — расказаў **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр САЗОНАЎ.**

**Часта падлеткі проста не ведаюць, што набыццё наркотыку ў інтэрнэт-краме кваліфікуецца як цяжкае злачынства. І такія нюансы трэба абавязкова даводзіць да дзяцей.**

Каб паменшыць гэтую жахлівую статыстыку, супрацоўнікі наркакантролю, інспекцыі па справах непаўналетніх праводзяць тлумачальную, інфармацыйную і прафілактычную работу ў навучальных установах. «Пры затрыманні асоб мы задаём пытанне: «Ты разумееш, што за гэта ёсць адказнасць?». Падлеткі ведаюць аб ёй, прызнаюць, што работа праводзілася. Але, тым не менш, ідуць на гэта. Па нашых назіраннях, спрабаваць і збываць наркотыкі іх падштурхоўвае жаданне рызыкнуць», — падкрэсліваў Аляксандр Сазонаў. Ён нагадаў, што за збыт наркотыкаў прадугледжана адказнасць ад трох гадоў пазбаўлення волі. У 2019 годзе ніжнюю мяжу змякчылі з улікам аб'ёму распаўсюджаных наркотыкаў. Але верхняя мяжа да 15 гадоў, а ў выпадку, калі наступіла смерць асобы з прычыны збыту, — да 25 гадоў, — нязменная.

**Суддзя судовай калегіі па крымінальных справах Мінскага гарадскога суда Тамара УНУКЕВІЧ** расказала, што з 2015 да 2020 года скарацілася колькасць асоб, асуджаных за нарказлачынствы. Але ў 2021 лічбы выраслі, за мінулы год да адказнасці прыцягнулі 2050 чалавек. Пры гэтым колькасць асуджаных непаўналетніх павялічылася практычна ўдвая. «Аналіз і разгляд падобных спраў паказвае: непаўналетнія актыўна выкарыстоўваюць камп'ютарную тэхніку, інфармацыйныя тэхналогіі, пляцоўкі інтэрнэт-крам. Асобы, якія ажыццяўляюць дзейнасць ад імя гэтых крам, на жаль, уцягваюць у работу па збыце і падлеткаў. Дзеці фасуюць забароненыя рэчывы, размяшчаюць у схованкі. Судамі рэгулярна праводзяцца прафілактычныя мерапрыемствы, выязныя і адкрытыя пасяджэнні. Злачынцы ў сваіх формах і метадах становяцца больш дасканалымі. Таму практыка па такіх справах абагульняецца і аналізуецца. Мы пастаянна выяўляем новыя тэндэнцыі, навучаем маладых суддзяў», — сказала спікер.

У круглым стале прынялі ўдзел і студэнты сталічных ВНУ. Будучыя юрысты, студэнты юрыдычнага факультэта БДУ падкрэслілі, што падлеткі не заўсёды ўсведамляюць ступень адказнасці за злачынства. Часта яны проста не ведаюць, што набыццё наркотыку ў інтэрнэт-краме кваліфікуецца як цяжкае злачынства. І такія нюансы трэба абавязкова даводзіць да дзяцей. Гэты тэзіс пацвердзілі і маладыя людзі, якія маюць да нарказбыту самае непасрэднае дачыненне. Па відэасувязі ў круглым стале ўдзельнічалі дзяўчаты, якія зараз адбываюць пакаранне ў выпраўленчай калоніі № 4 Гомеля. Кацярына і Вікторыя расказалі, што падчас вучобы ў школе ім расказвалі пра шкоду наркотыкаў. Але не казалі, што за гэта можа быць крымінальная адказнасць і нават пазбаўленне волі. Дзяўчаты падкрэслілі, што для эфектыўнай прафілактыкі ўжывання наркотыкаў і нарказбыту вельмі патрэбна, каб падлеткі сустракаліся з людзьмі, якія панеслі пакаранне і якія могуць шчыра расказаць свае гісторыі. Ведаючы жывы прыклад, падлеткі задумаюцца, ці патрэбныя ім такія «лёгкія грошы» або «новыя адчуванні».

Такую ж думку выказаў і **першы намеснік старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Андрэй СТРЫГЕЛЬСКІ.** «Удзел школьнікаў, студэнтаў у выязных і адкрытых судовых пасяджэннях вельмі эфектыўны, гэта пакідае заўважны след у свядомасці і памяці. Але такіх мерапрыемстваў стала менш. Ад пэўнай колькасці бацькоў атрымалі негатыўны водгук на гэтую форму работы. Дарослыя тлумачаць сваю пазіцыю тым, што гэта траўміруе псіхіку дзіцяці. Але бацькам трэба разумець, што менавіта такая форма працы ў найбольшай ступені зберажэ падлеткаў ад больш сур'ёзных наступстваў. Закрыць, засцерагчы штучна дзяцей ад негатыўных грамадскіх праяў — не выйсце. Дзіцяці трэба паказаць, з чым яно можа ў жыцці сутыкнуцца, і навучыць правільнай рэакцыі», — сказаў ён, звяртаючы ўвагу на тое, што бацькам трэба стаць саюзнікамі ў прафілактычнай рабоце.

Гэта асаблівa важна, калі прыняць да ўвагі, што сям'я — галоўная прычына праблемы наркаманіі ў падлеткаў. «Партрэт падлетка, які ўжывае наркотыкі, завязаны на ўмовах няправільнага выхавання: гіперпратэкцыя (узвядзенне дзіцяці ў культ), гіпапратэкцыя (зваротны бок гіперпратэкцыі, недахоп увагі і клопату) і ўмовы жорсткага абыходжання. З-за гэтага ў падлеткаў здараецца нервовы зрыў, і яны ідуць туды, дзе адчуваюць сябе бяспечна. Калі чалавек ужывае наркотык, натуральна, ён пазбягае рэчаіснасці, яму становіцца добра. Але праз гадзіну-дзве эфект адваротны. Тады ён пачынае ўжываць яшчэ і яшчэ», — расказаў **доктар юрыдычных навук, прафесар, практычны псіхолаг, загадчык кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ Вячаслаў ШАБАНАЎ.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Па сутнасці

# Замалёўкі палітычнай Дзіканькі



**Карцінка ўражвае. Дзеці. Данбас. Дзеці Данбаса. Спачуванне, скруха, хваляванні. Як дапамагчы, абараніць, схаваць ад трацілавай дэмакратыі. Гэта не палітыка. Гэта звычайная чалавечнасць. Людскасць. Палітыка была раней. У тым ліку моўнага генацыду. На гэтым тыдні свет адзначаў Дзень роднай мовы. Прэзідэнт на нарадзе з вучонымі НАН Беларусі, якая адбылася ў канцы студзеня, расставіў усе кропкі і злучнікі ў моўным пытанні. Руская і беларуская.**

Ва Украіне не знайшлі агульнай мовы. І зараз не шукаюць. Нават не імкнуцца. Родныя літары ператварылі ў знакі нацыянальнага падзелу і бойкі. Але ці ў Кіеве так вырашалі? Наўрад ці.

І справа не ў тым, што грунтоўныя па сваёй сутнасці шахцёры Данбаса не разумелі скнарлівых гаспадароў з прыцыснутых да Карпат вёсак Галічыны. Ну, напрыклад рускаму класіку Гогалю (у нараджэнні з Украіны) «изящная словесность Пушкина» не замінала ўлюбляць чытача ў простыя, але аздобленыя міфалагічнымі «фэйкамі» побыт маларасійскага жыцця. Дарэчы, зараз гогалеўскі Вій ажыў. Пайшоў у тыраж як персанаж палітычнай рэчаіснасці.

Міфалагічныя фэйкі ў літаратуры — гэта, кажучы па-сучаснаму, — прагляды. Фэйкі ў гісторыі — гэта, як паказвае жыццё, — трыгер для каляровых рэвалюцый і цёмнай будучыні. Грунтоўныя па сваёй сутнасці шахцёры Данбаса не здолелі пагадзіцца з моўным генацыдам, з гістарычным нацызмам. З «львівскай» тэорыяй перавагі. З адраджэннем бандэраўскіх метадаў. Пачакайце, але чаму бандэраўскіх? Занадта прыніжаю гэтыя «мЭтады» бруднага геапалітычнага мухляжу. Гэта ж прадказальныя паводзіны ўсіх хворых на вірус заходняй дэмакратыі. «Дэмакратычна толькі тое, што на наш погляд дэмакратычна». Данецкія нашчадкі франтавікоў не маглі пагадзіцца з тым, што па брукаванцы Крашчаціка будуць адбіваць абцасамі на маршы ўдзельнікі вогненнага шэсця.

Як цікава выходзіць. У Беларусі прайшло ўжо некалькі рэферэндумаў, ва Украіне за гэты час — некалькі рэвалюцый. І Украіну лічаць дэмакратычнай дзяржавай, Беларусь — апошняй дыктатурай Еўропы. За гэты час Украіна страціла сваю прамысловасць, энергетычную сістэму. У сэнсе — аддала алігархату. Украіна страціла свае тэрыторыі і людзей. Адных украінцаў марнуюць у акопах, каб тыя забівалі іншых украінцаў.

Як выходзіць. У саракавых XX стагоддзя ўкраінцаў прымусова пад брэх сабак вывозілі ў Еўропу. У лютым 2014-га украінцы па сваёй волі скакалі, як бы не «быць маскалём», але быць у Еўропе. Каб быць «зарабітчанамі». Гэты тэрмін так гарна гучыць на пявучай мове Шаўчэнкі. На прагматычнай мове Шылера гэты тэрмін гучыць больш канкрэтна — «остарбайтар».

Народ Украіны выхоўвалі і выхоўваюць смехапалітыкай «слуг народа» і «дзікімі танцамі» ўжо не на Еўрабачанні, а ў Радзе. Выхоўваюць: манной Майдана, пажарышчам Адэсы, артабстрэламі Данецка.

У гэтым месяцы ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'явілася новая выстава: «Сімвалы блакаднага Ленінграда». На гэтым тыдні — новая экспазіцыя аб генацыдзе беларускага народа. Жудасныя фотаздымкі, жахлівыя падрабязнасці. І аднолькавы боль: за дзяцей з пасівелымі душамі.

Душы дзяцей Данбаса працягваюць сівець. Каб зараз гогалеўскаму Вію расплюшчылі вочы, дык яму і паскудзіць не прыйшлося б. За яго ўсё зрабілі.

Беларуская літаратура не ведае Вія. Дзякуй богу. Беларуская рэчаіснасць не ведае шмат чаго дрэннага. Душы нашых дзяцей не сівеюць. Дзякуй уладзе. Але беларускаму грамадству прапануюць новыя казкі. Казкі знатнага гатунку. Замежнага. Варшаўскага. Вільнюскага. Усе па франшызе Вашынгтона. Сэнс адзіны. Як бы іх не драпіравалі — атрута застанецца атрутай.

Цікава: борт у мінскім аэрапорце заўважылі ўсе, а падзенне рэйтынгу пасля ўзлёту амерыканскага судна ў Кабуле забыліся. Тое значна падмачыла рэпутацыю Байдэна. Ну расплюшчыце яму вочы... І той частцы народа, якая паводзіць сябе як народзец. Гучыць абразліва?!. Не! Прароча. Як можна хціва ўсміхацца, калі абражаюць тваю маці, калі нагаворваюць, абвінавачваюць у тым, што яна не рабіла, калі патрабуюць пусціць яе з жабрацкай торбай. Калі лайкалі навіны з пасадкай самалёта, міграцыйным крызісам, заклікамі да санкцый, вы рабілі тое ж самае. Плюнулі ў твар сваёй маці. У твар Беларусі. Гэта называецца дэградацыя. Што стала з тымі летуценнікамі «апазЫцыі»? Да стаўпоў старога БНФ можна было б дастукацца на мове. Зараз выраджэнцы «апазЫцыі» разумеюць толькі падманную мову экстрэмісцкіх тэлеграм-каналаў ну і... наведвальнікаў з ГУБАЗіКа. Непаважанае неверагоднае неспадарства, дэмакратычны працэс вам не спыніць. Не стрымаць рэферэндум беларусаў. Тармазіць вам пасуе толькі саміх сябе. Напрыклад, у сацыяльных сетках стала вірусным відэа збеглай «філЯлЯгіні». Яна нават не ведае мовы. Дыплом настаўніцы мовы ёсць. Ведаў няма. Падтрымкі ўжо таксама. Застаецца толькі брахаць на людзей і на сваю краіну з чужой ускраіны. З палітычнай Дзіканькі.

Беларусь для нас маці. А сапраўдныя дзеці ніколі не дадуць сваю маці ў крыўду. Дарэчы, і бацька таксама побач.

Расплюшчыце ім вочы. Світанне.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ДАЧНІКІ РЫХТУЮЦЦА ДА ПАСЯЎНОЙ

## Харчовая бяспека

Якасць насення — адзін з ключавых фактараў, якія вызначаюць ураджай любой культуры. Менавіта ад пасяўнога матэрыялу шмат у чым залежыць радасць або расчараванне агародніка, калі прыйдзе час збору ўраджаю. Частка кампаній займаецца толькі фасоўкай і рэалізацыяй насення айчынных, расійскіх і замежных фірмаў (у гэтым выпадку магчыма трапіць і на выдатны пасяўны матэрыял, і на перасорціцу, кажуць вопытныя агароднікі), прадстаўлена і насенне непасрэдна ад селекцыянераў. Словам, выбар вялікі, як і цэны. На шчасце, існуюць агульныя правілы, якія дазваляюць пазбегнуць расчараванняў. Да таго ж у кожнага дачніка са стажам у пытанні выбару фірмы па вытворчасці насення ёсць свае перавагі.



— Перш за ўсё варта звярнуць увагу на ўраджайнасць, — раіць Аксана Клімковіч, прадавец адной з буйных сталічных гандлёвых пляцовак, дзе прадаецца насенне. — Але не заўсёды варта выбіраць высокаўраджайнае насенне. Трэба цвяроза ацэньваць свае сілы. Высокаўраджайнае насенне пры вырошчванні на прысядзібным участку можа і не даць сапраўды высокі ўраджай. Чым больш высокаўраджайны сорт, тым больш ён патрабавальны да складу глебы, умоў вырошчвання, догляду, агратэхнікі. Калі вы не ўпэўнены, што зможаце такія ўмовы яму даць у сябе на дачы ці на ўчастку ў вёсцы, лепш выбраць менш «пераборлівае» насенне. На самай справе, часам непатрабавальныя сарты дадуць большы ўраджай ва ўмовах вашых сотак, чым высокаўраджайныя, якія падыходзяць прафесіяналам.

А вось устойлівасць сорту (да ўмоў надвор'я, хвароб, шкоднікаў) — той крытэрый, які ў нашым капрызным клімаце выходзіць на першае месца.

— У красавіку — спякота, у чэрвені — засуха, у ліпені — раптам халодна і дажджы, у жніўні — зноў +30! Тут і ў людзей дрэнна са здароўем — што ж казаць пра расліны! — наракае Алена Сцяпанаўна, адна з пакупніц.

Яна распавядае, што падрыхтоўку да кожнага дачнага сезона пачынае яшчэ ў снежні—студзені: вырашае, што пасадзіць (каб былі і ранні ўраджай, і позні — восенню) і куды: што — у цяпліцу, што — у адкрыты грунт. Потым прыдзірліва выбірае сарты, вывучаючы інфармацыю, і нават малюе план пасадак (для гэтага ў яе ёсць спецыяльныя сшыткі). І пастаянна раіцца на форуме агароднікаў.

— Калі прыйсці купляць насенне без дакладнага плана, вочы разбягаюцца, і можна накупляць занадта шмат, а месца на пасадкі не хопіць. У мяне так некалькі разоў было, цяпер я ўжо дасведчаны дачнік, — усміхаецца суразмоўца. — Да пенсіі працавала бухгалтарам, так што лічыць мне не ў навінку. А купляць лішняе занадта дорага: можна тут усю пенсію пакінуць і не заўважыць. Кошт пакуначкаў з насеннем, здаецца, не такі вялікі, але вы ўлічыце, што ў пакуначку ўсяго пяць—сем—дзесяць семак. А хочацца ж узяць розныя віды. Я, напрыклад, вырошчваю восем відаў памідораў (у нас у сям'і іх любяць), чатыры сарты агуркоў, тры віды перцу салодкага і адзін горкі, баклажаны двух сартоў. Яшчэ цыбуля-часнок, зеляніна, кабачкі — гэта толькі агародніна. Вось і лічыце.

Суразмоўніца перакакана, што добры ўраджай на дачных сотках — гэта перш за ўсё дакладнае планаванне.

— На расаду ж таксама не ўсё адначасова трэба высейваць. Спачатку баклажаны і перац, потым — памідоры, іх можна сеяць у сярэдзіне сакавіка, і ў красавіку — агуркі. Я вырошчваю і агуркі праз расаду — не ўсе, а трошачкі, на ранні ўраджай. Самы пачатак чэрвеня — а ўнукі ўжо храбусцяць агурочкамі ўласнага свежага ўраджаю!

Яшчэ адзін важны крытэрый пры выбары насення — лёжкасць ураджаю (гэта ўжо датычыцца позніх сартоў).

— Агародніна цяпер дарагая, так што лепш есці і закатваць сваё, — дзеліцца яшчэ адзін пакупнік «Садовага свету». — Без пестыцыдаў, без усялякай хіміі. Вядома, даводзіцца ўкладваць працу, сілы.

Для пажылых людзей набыццё насення — прыемны і надзвычай цікавы занятак, і калі форумы агароднікаў-садаводаў — гэта свайго роду «клуб», то штогадовая купля насення перад пачаткам дачнага сезона, мабыць, — «выхад у свет». Нягледзячы нават на ковід, пенсіянеркі (а жанчын у аддзеле насення — большасць) не могуць прапусціць гэты момант.

— Мне дзеці прапаноўвалі купіць насенне па інтэрнэце, але я хачу купляць сама. Наогул, не разумею гэтых пакупак праз інтэрнэт. Як гэта не пагледзець, не памацаць, не пагаварыць? — разважае Таццяна Андрэеўна, з якой мы разгаварыліся каля стэлажоў з насеннем памідораў. — Тут і параіцца можна з кімсьці з іншых агароднікаў, хто ўжо купляў сорт, які я яшчэ не спрабавала. Вось пазалетась мне тут параіла жанчына сорт памідораў «Джэк-пот», мне спадабаліся: вельмі раннія і шмат памідораў з адной расліны. «Малінавы цуд» наша сям'я яшчэ любіць. А вось чорныя памідоры — на аматара, мне асабіста яны здаюцца занадта салодкімі.

— «Мангольскі карлік» не бралі? — адцягвае ўвагу маёй суразмоўніцы іншая пакупніца.

— Сястра брала, спадабаліся. Саломку падсцілаць трэба, яны кладуцца. Вырошчваюцца без пасынкавання. Там напісана на пакуначку, прачытайце.

Аргумент «у інтэрнэце насенне таннейшае» суразмоўніца адмяла — кажа, не таннейшае. Каштуе сёння пакецік насення ад 60—68—99 капеек (айчынная і расійская вытворчасці) да пяці—сямі рублёў (Расія, Польшча, Італія, Галандыя). У сярэднім трэба разлічваць: адзін пакецік — адзін—два рублі. У сартыменце, напэўна, усё, што ў прынцыпе магчыма вырасціць у нашых шыротах (нават такія вынаходствы, як насенне мікразеляніны — капусты розных відаў і рукалы). На дарагіх пакецiках часта можна знайсці пазнаку F1 (гібрыды). Стаўленне да іх у агароднікаў неадназначнае. Многія бяруць, іншыя кажуць, што выдатны ўраджай магчымы, але «калі пашанцуе».

Пад насенне кветак адведзены асобныя стэлажы, і тут не так шматлюдна, як у «агародных» шэрагах. Кветкі ўжо высейваюць на расаду: і петуніі, і лабеліі, і лаванду, і пеларгоніі.

— Раней у мяне на ўчастку былі толькі клумбы і газонная траўка, — распавядае Галіна Пятроўна. — Але ў апошнія гады разбіла градкі — так бы мовіць, для харчовай бяспекі сям'і. Захавала вялікі кветнік каля дома, гэтым летам хачу пасадзіць там што-небудзь новенькае — вось прыехала ў вялікі магазін, тут большы выбар.

## У дапамогу агародніку

Аддзел ручнога садовага інструменту пакуль ажыятажным попытам не карыстаецца. Тут шматлюдна стане пазней, калі пачне прыграваць сонейка, тлумачаць прадаўцы.

Звычайны набор дачніка — штыкавая рыдлёўка з заточаным краем (для перакопвання, абрэзкі беражкоў, перасадкі раслін), садовыя вілы, матыка (у народзе «цяпка») і граблі. І, вядома, тачка, сімвал «савецкага дачніка».

Купіць рыдлёўку, аказваецца, задача не з простых. Напрыклад, важна, каб таўшчыня ляза (заточанай часткі) складала не менш за 1,5 мм. Тронак цяпер робяць часцей з пластыку: лёгкі, сучасны матэрыял, не баіцца волкасці і з яго лёгка выдаліць забруджванні. Ёсць рыдлёўкі з металічнай ручкай — надзейныя, але дастаткова цяжкія і даражэйшыя. Каштуе рыдлёўка ў дыяпазоне ад 15 да 53—72 рублёў. Можна купіць асобна ўласна рыдлёўку і драўляную ручку прыдатнай даўжыні — самы бюджэтны варыянт. Рыдлёўкі за паўсотні ёсць расійскай, ёсць нямецкай вытворчасці, цалкам металічныя і, напэўна, вечныя — можна перадаваць у спадчыну.

— Але я заўсёды купляю рыдлёўкі з драўляным тронкам, — тлумачыць дачнік са стажам Сяргей Леанідавіч. — Яно і звыкла нашаму пакаленню, і экалагічна, як цяпер кажуць. Лепш за ўсё, калі тронак будзе з асіны — яна трывалая і добра ўбірае вільгаць. Глебы ў нас досыць цяжкія, — працягвае «экскурсію» суразмоўца. — А вілы з многіх сучасных матэрыялаў нетрывалыя і часам не вытрымліваюць. Так што вілы лепш за ўсё купляць са сталі.

Каштуюць вілы ад 13 рублёў (расійская вытворчасць) да 27,90 (айчынныя, з рамантычнай назвай «Маладосць мая»). Прыкладна столькі ж прыйдзецца дачніку выкласці за граблі двух відаў (садовыя, для працы з зямлёй, і веерныя — для зграбання лісця і скошанай травы).

— І матыка, і граблі павінны быць суцэльнаметалічнымі. Кляпаныя не вельмі надзейныя, — кажа суразмоўца.

Гэта аснова, але кожны садавод-агароднік падбірае таксама для сябе і набор спецыяльных інструментаў, зыходзячы з любімых культур. Аэратар, пласкарэзы, культыватары, рыхліцелі...

— Вельмі важна выбраць садовы інструмент, які будзе «па руцэ» менавіта вам, — тлумачыць кансультант гандлёвай залы. — Перад купляй патрымайце выбраную мадэль у руках. Перш за ўсё звярніце ўвагу, ці зручна вашай руцэ, калі вы трымаеце інструмент. Калі не, лепш паспрабаваць яшчэ які-небудзь варыянт: выбар, вы самі бачыце, вялікі. Важная і вага інструмента, асабліва калі гаворка ідзе пра рыдлёўку, вілы, граблі. У нас садоўнікі-агароднікі — часта пажылыя жанчыны, так што вага інструмента не павінна быць вялікай, каб менш стамляцца падчас працы. Акрамя таго, у тых жа рыдлёвак бываюць ручкі рознай даўжыні — пад розны рост чалавека. Гэты момант таксама трэба ўлічваць.

— Яшчэ трэба паглядзець, як ручка прымацаваная да працоўнай часткі, — кажа Сяргей Леанідавіч. — Я дачнік ужо, дай бог, хутка 20 гадоў, і магу сказаць, што гэта — месца частай паломкі садовага інструмента. Таму гляджу, каб ручка сядзела вельмі шчыльна, не было ніякага зазору.

А што з цаной: выбіраць даражэй або пашкадаваць грошы? З аднаго боку, садовы рыштунак наўрад ці варта купляць утрая даражэй, з другога — цана часам вызначае якасць. А паколькі купляюць яго надоўга, магчыма, варта разгледзець не самыя танныя варыянты.

**Дзіяна РОНІНА.**
**Фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Здарэнні

## НА ШЛЯХУ НАТУРАЛЬНАЙ МІГРАЦЫІ...

### Агучана прычына гібелі лясных волатаў

**Аб выніках расследавання здарэння на рацэ Мядзянцы, у якім загінулі 22 асобіны зубра, інфармуе Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў дадатак да раней размешчанай інфармацыі ад 13 студзеня «НЗ на лёдзе: 21 зубр праваліўся пад лёд у Свіслацкім раёне Гродзенскай вобласці».**

Загінулыя зубры знаходзіліся ў складзе аднаго са статкаў белавежскай мікрапапуляцыі зубра (колькасцю не менш за 100 асобін), якая здзяйсняла сезонны міграцыйны пераход.



Пры пераадоленні вадаёма на рацэ Мядзянцы («Навадворскае возера») частка з іх правалілася пад лёд. Шырыня воднай перашкоды ў дадзеным месцы склала 50—70 метраў, глыбіня ў цэнтральнай частцы (асноўнае рэчышча ракі) — каля двух метраў.

Па высновах камісіі, асноўнай прычынай гібелі жывёл з'явілася гіпатэрмія ў выніку працяглага знаходжання жывёл у вадзе з-за ледзяной покрыва ў пастаянным месцы пераходу праз рэчышча ракі (на шляху іх натуральнай міграцыі).

Цяпер колькасць зубра еўрапейскага ў белавежскай мікрапапуляцыі складае 630 асобін. Пры гэтым, улічваючы стан белавежскай мікрапапуляцыі зубра, раён яе пражывання, а таксама экалагічныя ўмовы і іншыя фактары, збалансаваная мяжа колькасці вучонымі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўстаноўлена да 350 асобін.

## СЛУЖБОВЫ САБАКА ВЫСАЧЫЎ ДАЧНАГА ЗЛОДЗЕЯ

**На лінію «102» Пухавіцкага РАУС паступіла паведамленне аб крадзяжы ў адным з населеных пунктаў раёна. Гаспадыня дачнай хаты выявіла разбітае акно, знікненне грашовых сродкаў і рознай маёмасці.**

На месца здарэння ў складзе следча-аператыўнай групы прыбыў міліцыянер-кінолаг Пухавіцкага аддзела аховы са службовым сабакам. Падчас адпрацоўкі прыдомавай тэрыторыі той хутка ўзяў след і прывёў супрацоўнікаў у лясны масіў, дзе ўдалося знайсці пальчаткі падазраванага. Доўгі шлях нямецкая аўчарка зрабіла ў бок праезнай часткі, дзе праз некаторы час уцекача затрымалі, паведамляе падрабязнасці МУС.

Падазраваным аказаўся 33-гадовы беспрацоўны мінчанін. Частку маёмасці ўдалося вярнуць уладальніцы, прычыненая шкода склала больш за пяць тысяч рублёў.

Высветлілася, што раней мужчына ўжо абакраў гараж у гэтым жа населеным пункце, выкраўшы электраінструмент. У дачыненні да мінчаніна распачаты дзве крымінальныя справы за крадзеж. Цяпер устанаўліваецца датычнасць фігуранта да крадзяжоў, здзейсненых у іншых раёнах вобласці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Уважаемые акционеры*
*ОАО «Минский домостроительный комбинат»!*

**30 марта 2022 года в 15.00**

СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

## ОАО «Минский домостроительный комбинат»

**по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал)**

**Повестка дня очередного общего собрания акционеров:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях развития Общества на 2022 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета за 2021 год.
3. Заключение ревизионной комиссии по результатам проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год.
4. Заключение аудитора по результатам аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год.
5. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021 год.
6. Утверждение использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год.
7. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, в 2022 году и I квартале 2023 г.
8. Избрание членов наблюдательного совета.
9. Избрание членов ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
11. Об утверждении локальных правовых актов.

Реестр акционеров для участия в собрании будет сформирован по состоянию на 18 марта 2022 года.

С материалами по вопросам повестки дня собрания, лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г.Минск, ул. Пономаренко,43 (группа долевого строительства) в следующем порядке:

- с 10.03.2022 г. по 29.03.2022 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.45 по месту нахождения Общества, в день проведения собрания – с 9.00 до 13.30 по месту его проведения – с информацией о деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях деятельности на 2022 год;
- с 22.03.2022 г. по 29.03.2022 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.45 по месту нахождения Общества, в день проведения собрания – с 9.00 до 13.30 по месту его проведения – с иными материалами по вопросам повестки дня собрания акционеров.

Регистрация участников собрания будет осуществляться 30 марта 2022 г. с 14.15 до 14.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

*Наблюдательный совет*
*ОАО «Минский домостроительный комбинат»*

УНП 100258980

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет аукциона – Лот:**

1) Капстроение с инв. № 235/С-9641 (наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 1388,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, 13, восточнее д. Богатырь, составные части и принадлежности: навес. 2) Капстроение с инв. № 235/С-9642 (наименование: открытая складская площадка; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ), площадью 5360,1 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, восточнее д. Богатырь, составные части и принадлежности: ограждение, двое ворот, две площадки; 3) Стройматериалы, вложенные в строительство следующих объектов, расположенных по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, восточнее д. Богатырь: 3.1) Административно-бытовой корпус ГПК (объект 2/87-1-1); 3.2) Административно-бытовой корпус РММ (объект 2/87-8-1); 3.3) Внутриплощадочные сети водопровода (объект В1-В3 2/87-ОНВК); 3.4) Газораспределительный пункт (объект 2/87-13); 3.5) Котельная с инженерными сооружениями (объект 2/87-5); 3.6) Ливневая канализация, пруды-отстойники (объект 2/87 0-НВК); 3.7) Наружное электроснабжение (объект 2/87-С1-ЭС); 3.8) Подъездная автодорога с проездами и площадками (объект 2/87-0); 3.9) Пожарное депо (объект 2/87-16); 3.10) Цех подготовки сырья (объект 2/87-3).
Все объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 225183012101000094, площадью 26,3060 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 45 740,00 | Размер задатка, руб. | 4 574,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», 211162, Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона не позднее 09 марта 2022 г. 17.00. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи в течение 15 дней с даты подписания договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Шаг торгов:** 5 % от начальной цены продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона оплачивает затраты на организацию и проведение торгов, в том числе вознаграждение Организатору аукциона

**Аукцион состоится 10 марта 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона и иная инфорация содержатся на официальном сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве bankrot.gov.by, на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 09 марта 2022 г. до 17.00**

Уважаемые акционеры
## ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!
*(223610, г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6)*

Во Дворце культуры сахарорафинадного комбината
**30 марта 2022 года в 15.00**
по адресу: г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6

**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ**
**акционеров открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

**1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2021 год и направлениях развития на 2022 год:**
- *Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2021 году и основных направлениях деятельности Общества на 2022 год;*
- *Отчет Наблюдательного Совета о проделанной работе;*
- *Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии в 2021 году и заключение по бухгалтерскому балансу и годовому отчету Общества;*
- *Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2021 год с учетом аудиторского заключения;*
- *Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2021 год.*

**2. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2022 год.**
**3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2021 год.**
**4. Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.**
**5. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.**
**6. Утверждение новой редакции устава ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составляется на 01 марта 2022 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 14.00 до 15.00 по месту его проведения.

Время и место ознакомления с материалами, предоставляемыми для ознакомления лицам, имеющим право на участие в общем собрании: в рабочие дни, начиная с 10.03.2022 по 29.03.2022 г. по месту нахождения Общества с 8.00 до 17.00 (ул. Головащенко, 6, каб. № 202, холл второго этажа) или по телефону 8 017 95 45328, а в день его проведения – по месту проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

В связи с эпидемиологической ситуацией в стране, с целью минимизации риска распространения короновирусной инфекции информируем Вас, что **во время регистрации и проведения собрания акционеров использование средств индивидуальной защиты ОБЯЗАТЕЛЬНО!**

*Дирекция, Наблюдательный Совет*
*ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».*

УНН 600075003

### ОТЧЕТ
### Местного фонда развития международного сотрудничества и местных инициатив «Региональное партнерство» об использовании своего имущества за 2021 год

Местный фонд развития международного сотрудничества и местных инициатив «Региональное партнерство» зарегистрирован Управлением юстиции Витебского областного исполнительного комитета решением № 21 от 15.07.2015 и внесен в ЕГР за № 390541078. Адрес фонда: 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, каб. № 3. Количество учредителей фонда – 1.

Информация о стоимости имущества фонда: 3 291 бел. руб., стоимость имущества, переданного учредителем фонда 3 178 бел. руб.; поступления от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий: 0 бел. руб, доходы, полученные от осуществления в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности – 0 бел. руб.; иные не запрещенные законодательством поступления – 0 бел. руб. Расходы, понесенные фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе, составляют 0 бел. руб. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвовал в создании других юридических лиц.

УНП 390541078

УНП 805001004

### СПРАВАЗДАЧА
### Міжнароднага дабрачыннага фонду «Праект дапамогі дзецям Чарнобыля» аб выкарыстанні сваёй маёмасці за 2021 год

1. Колькасць заснавальнікаў Фонду – 8.
2. Набытая маёмасць – 0 будынкаў (3 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, перададзеныя на бязвыплатнай аснове).
3. Грашовыя сродкі, якія паступілі ад заснавальнікаў у якасці замежнай дабрачыннай дапамогі – 172 160,00 еўра.
4. Грашовыя сродкі ад грамадзян Рэспублікі Беларусь – 620,00 беларускіх рублёў.
5. Агульная сума расходаў, панесенных Фондам на дасягненне грамадска карысных мэтаў, якія адпавядаюць статуту – 514 005,13 беларускіх рублёў.
6. Прадпрымальніцкая дзейнасць Фондам не ажыццяўлялася.

*Дырэктар Фонду* *Т. У. Кліндзюк*

### ОТЧЕТ ПО ИСПОЛЬЗОВАНИЮ ИМУЩЕСТВА
### Местным фондом издания газеты «Охотник и рыболов» за 2021 г.

1. Учредителем Фонда является Республиканское государственно-общественное объединение «Белорусское общество охотников и рыболовов».
2. Имущество Фонда составляют:
основные средства – 5,7 тыс. руб.;
материальные запасы – 0,8 тыс. руб.
Доходы, полученные Фондом за 2021 г., – 153,8 тыс. руб.
3. Расходы, понесенные Фондом на достижение общественно-полезных целей, за 2021 г., – 150,1 тыс. руб.
4. Унитарных предприятий и хозяйственных обществ Фонд не имеет.

УНП 100163559

ООО «Фрондера» в газете «Звязда» от 15.02.2022 было размещено объявление (с опечаткой во времени регистрации) о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, назначенного на 28.02.2022 в 14.00 и 21.03.2022 в 14.00. Окончательная регистрация участников аукционов состоится 28.02.2022 и 21.03.2022 с 13.30 до 13.55. Подробнее о торгах по телефону +375293042560. УНП 192789344

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества СЗАО «ЛадаГарант»

| Лот | Наименование | Местонахождение лотов | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Комплект полок для документов, 2 шт. | Республика Беларусь, Минский район, д. Обчак, 223010 | 89,04 | 8,90 | 4,45 |
| 2 | Кресло офисное Менеджер DF HLN SP-A, 4 шт. | | 369,60 | 36,96 | 18,48 |
| 3 | Стол письменный на мет.опорах, 1 шт.; Стол письменный на мет.опорах, 2 шт; Стол письменный на мет.опорах, 2 шт.; Стол письменный криволинейный левый, 1 шт.; Стол письменный криволинейный правый, 4 шт.; Стол письменный на мех опорах, 1 шт. | | 3234,00 | 323,40 | 161,70 |
| 4 | Стол приставка (К373), 1 шт.; Стол приставка (К371/Кредо/брнат), 6 шт.; Стол приставка (К372/Кредо/брнат), 6 шт.; Стол приставка (К373/Кредо/брнат), 4 шт.; Стол приставка (К374/Кредо/брнат), 1 шт. | | 1814,40 | 181,44 | 90,72 |
| 5 | Тумба под системный блок (К510/Кредо/брнат), 11 шт.; Тумба приставная, 9 шт. | | 922,32 | 92,23 | 46,12 |
| 6 | Шкаф (Т404/Тема/плт), 1 шт.; Шкаф для одежды (К49С+КДЗ/Кредо/брнат), 2 шт.; Шкаф для документов, 2 шт.; Тумба (Т180/Тема/брнат), 1 шт.; Шкаф для документов (Т100+ТД12/Тема/плт/брнат), 1 шт.; Шкаф для документов (Т404/13/0949+МТ1/13/0950/Тема/плт, 1 шт.; Шкаф для документов, 1 шт.; Шкаф для документов, 3 шт.; Шкаф для документов, 2 шт.; Шкаф для документов, 2 шт. | Республика Беларусь, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16 | 2252,88 | 225,29 | 112,64 |
| 7 | Копировальный аппарат Mita KM 1635, 1 шт.; Копировальный аппарат Mita KM 1620, 1 шт.; Аппарат факсимильный Panasonik KX-FT984RU-B, 1 шт.; Системный ТА KPDP 38 SER/RUA, 2 шт.; Сканер HP SJ G2710 A4, 1 шт.; Принтер HP LJ 1010 USB с кабелем, 1 шт.; Принтер HP LaserJet P1102, 1 шт.; Терминал Panasonic KX-TS2365RUVV, 2 шт.; Факс Panasonic KX-FP218 RU, 1 шт.; Калькулятор Citizen SDC-435 N, 1 шт. | | 584,64 | 58,46 | 29,23 |
| 8 | ПЭВМ Jet I (13C907) Intel G 2120; Intel G 2120, 4Gb. 500Gb DVD-RW, ATX-450W; ПЭВМ DELTA Delux; ПЭВМ SKI SYSTEMS; ПЭВМ Celeron; Процесср Intel Celeron D341-2.93GHz/Мат. плата Asus P5PL2/Мод. памяти DDRII 512 MB/HDD 80GB SATA/FDD 3.5''/DVD-ROM Sony/Video GF PCX6200TC/ Корпус ATX 300W; Сет. адаптер 2xD-Link 1-port UTP 10/100; Монитор 17'' Philips 170S7FS; Клавиатура; Мышь компьютерная; ПЭВМ Celeron; Процесср Intel Celeron D341-2.93GHz/Мат. плата Asus P5ПВ1/Мод. памяти DDR 512 MB/2xHDD 80GB SATA/FDD 3.5''/DVD-ROM Sony/Video GF PCX6200TC/ Корпус ATX 300W; Сет. адаптер D-Link 1-port UTP 10/100; ПЭВМ Prestigio; Cel 1.8/1024/160/DWDRW/FDD; ПЭВМ Prestigio (системный блок); Монитор LCD Philips 170C8FS; Клавиатура Chicony KB; ПЭВМ Prestigio; Cel. 3.2/512/160/DVDRW; Монитор 19'' ACER, 1 шт.; Keyboard, 1 шт.; Мышь компьютерная, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio; Pen 4/512MB/80GB/FDD 3.5''/DVD-RW, 1 шт.; Клавиатура, 1 шт.; Мышь компьютерная, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio; Cel2/8/512/DVDCDRW, 1 шт.; Монитор 19'' LCD, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio 0799-1200 Celeron Dual-Core 1200/1024/160 DVDRW, 1 шт.; 170C8FS Монитор Phyilips 17'' LCD C8 FS, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio 19B3645, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51 INTEL, 1 шт.; ПЭВМ DELTA/ASROCK H61M-VG3/INTEL; Pentium G2020 29ГГц/DDR3 4GB 1600MHz/ жесткий диск 500Gb SATA /пишущий CD-DVD/RW, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; Процессор 40 Gb/DDR 256Mb /300W/FDD, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; Мышь A4 Tech BW35, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; Клавиатура Chicony KB-9810MB PS/2. 1 шт. | | 708,96 | 70,90 | 35,45 |
| 9 | Холодильник МХ-2823-80, 1 шт. | | 193,20 | 19,32 | 9,66 |

В отношении вышеуказанных лотов проводятся вторые повторные торги. Стоимость снижена на 30 %.
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 237 (29606) от 08.12.2021, стр. 10, № 11 (29633) от 19.01.2022, стр. 10

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **11 марта 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | с 10.00 **28 февраля 2022 года** до 16.00 **9 марта 2022 года** |

**Условия для участия в торгах**:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту __, СЗАО «ЛадаГарант», проводимых 11.03.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр.лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста составляет 7,5 % (семь целых пять десятых процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: +375 29 304 25 60 (Андрей), +375 17 219 75 69 (Дмитрий).
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **СЗАО «ЛадаГарант», 220014, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16) (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293953088 (Илья)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 ЛЮТАГА 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (15927)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Анастасія МІХНАВЕЦ:

# «Зрабіла крок да мары — стаць салісткай опернага тэатра»



**Нягледзячы на тое, што наша суразмоўніца яшчэ толькі вучыцца на пятым курсе Акадэміі музыкі, ужо шмат чаго паспела дасягнуць. Падчас нядаўняй цырымоніі ўручэння прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» прайшоў вялікі канцэрт. У той дзень у гераіні матэрыялу адбыўся дэбют. Раней Анастасія Міхнавец прымала ўдзел у міжнародных музычных конкурсах, дзе атрымлівала розныя ўзнагароды, але менавіта на сцэне Палаца Рэспублікі маладая спявачка ўпершыню стаяла побач з народнымі артыстамі і опернымі выканаўцамі — людзьмі, на якіх арыентуюцца студэнты Акадэміі музыкі. «Чырвонка. Чырвоная змена» паразмаўляла з дзяўчынай аб уражаннях ад выступлення, уласных творчых планах і дзяцінстве, якое таксама было звязана з музыкай.**

***— Анастасія, распавядзіце, у якім узросце ёй зацікавіліся?***

— Так склалася, што ў нашай сям'і ўсе так ці інакш мелі дачыненне да музыкі. Мая маці скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, спявала ў хоры. Бацька і бабуля таксама выдатна спявалі. Увогуле, усе жанчыны ў нашай сям'і мелі прыгожыя, з добрай інтанацыяй і глыбокім тэмбрам, галасы. І, дзякуючы сямейнаму захапленню, музыкай зацікавілася і я. У нас дома стаяла старэнькае фартэпіяна «Беларусь», на якім я з маленькага ўзросту спрабавала нешта іграць — ставіла ноты перад сабой і старанна рабіла выгляд, што ўсё разумею *(смяецца)*. Напэўна, гэта было маёй любімай забавай. Таму, калі надышоў час аддаваць мяне ў школу, мама адразу сказала, што мне трэба займацца музыкай з педагогам.

Мы абралі 102-ю музычную школу, якая знаходзіцца ў сталічнай Серабранцы. Цяпер гэта 17-я гімназія. Я праўчылася там дзевяць гадоў як піяністка і хацела звязаць сваё жыццё менавіта з фартэпіяна і выкладаннем. У мяне добра атрымлівалася іграць, я брала ўдзел у рэспубліканскіх конкурсах, дзе заваёўвала прызавыя месцы.

***— Ці быў у жыцці педагог, які паўплываў на ваш прафесійны лёс?***

— У 9 класе я трапіла на ўрок да Валянціны Канстанцінаўны Садоўскай, былой салісткі нашага опернага тэатра. Выдатная жанчына, якая накіравала мяне ў гэтую прафесію. Яе ініцыятывай і жаданнем было, каб я звязала жыццё з музыкай.

Вельмі хацела паступіць у кансерваторыю і ўжо ў 11 класе пайшла на праслухоўванне. Шчыра кажучы, я ім не спадабалася.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найлепшых

# ІДЭІ, ЯКІЯ НЕ ПАКІДАЮЦЬ РАЎНАДУШНЫМ НІКОГА

**Матываванасць, згуртаванасць, упартасць і вера ў поспех — вось крэда каманды, якая прадставіла ў гранд-фінале рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» сваю распрацоўку — сэнсарную пальчатку для алічбавання жэстаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Над праектам працавалі вучаніцы Акцябрскай сярэдняй школы Віцебскага раёна Лізавета ІВАНОВА і Эвеліна МАРОЗАВА пад кіраўніцтвам сваёй настаўніцы інфарматыкі Хрысціны Куставай. Дарэчы, іх ідэя перамагла ў намінацыі «Ахова здароўя» (медыцынскія тэхналогіі, фармацыя, бія- і нанаіндустрыя).**



**Лізавета Іванова і Хрысціна Кустава: «Наша распрацоўка надзвычай актуальная для ўстаноў аховы здароўя».**

— Наша ідэя заключалася ў тым, каб дапамагчы людзям з абмежаванымі магчымасцямі кантактаваць з тымі, хто не ведае мову жэстаў, — патлумачыла Лізавета Іванова. — Гэта надзвычай актуальна для ўстаноў аховы здароўя, прыёмных аддзяленняў бальніц, аптэк, сацыяльных устаноў, дзяржаўных органаў улады... Звычайна людзі, якія размаўляюць на мове жэстаў, пішуць тое, што ім трэба, на паперы ці на экране смартфона, каб іх зразумелі. Але як быць у экстранных выпадках, калі чалавеку патрабуецца неадкладная медыцынская дапамога? Добра, калі б такія пальчаткі мелі ў сваім арсенале брыгады хуткай дапамогі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

размеркаванне

# «ХАЧУ ЗАСТАЦЦА Ў ПРАФЕСІІ!»

## З якімі думкамі жыве і працуе малады заатэхнік у вёсцы

**У сельскагаспадарчых ВНУ гарачая пара. Менавіта зараз сотні хлопцаў і дзяўчат вызначаюцца са сваім першым працоўным месцам. У лютым мінулага года сярод выпускнікоў быў і наш герой. Статус студэнта Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Сямён ГАЯНКОЎ адразу змяніў на пасаду галоўнага заатэхніка ААТ «Прывольны агра» Слаўгарадскага раёна. Пра матывацыю, выбар і першы прафесійны вопыт маладога спецыяліста чытайце ў нашым матэрыяле.**

### НУ, РАГУЛІ ДЫК РАГУЛІ...



Сямён згадвае, як усё адбывалася, і прызнаецца, што, у адрозненне ад сваіх таварышаў, быў спакойны.

— Пры размеркаванні ўлічваўся сярэдні бал усіх сесій за чатыры з паловай гады навучання, таксама ацэньваўся ўдзел у спартыўным і культурным жыцці ВНУ. Я заўсёды быў актыўны: займаўся футболам, баскетболам, валейболам, флорболам, гандболам, настольным і вялікім тэнісам... У акадэміі для гэтага ствараліся ўсе ўмовы, у вольны час без праблем можна было займацца ў секцыях тым, што больш падабаецца. Ды і вучобу ніколі не закідваў. Таму ведаў, што змагу сам выбіраць месца працы.

Са шматлікіх варыянтаў Сямён найбольш упадабаў ААТ «Прывольны агра» Слаўгарадскага раёна. Гэтая гаспадарка прапаноўвала добрыя ўмовы працы, таксама важную ролю мела яе геаграфічнае размяшчэнне.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

# ІДЭІ, ЯКІЯ НЕ ПАКІДАЮЦЬ РАЎНАДУШНЫМ НІКОГА

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сэнсарная пальчатка ўзаемадзейнічае са смартфонам з устаноўленай на ім мабільнай праграмай «EasySay», выкарыстоўваючы тэхналогію bluetooth. Жэсты распазнаюцца праграмай і выводзяцца на экран смартфона ў выглядзе тэксту.

У намінацыі «Нацыянальная бяспека, абарона ад надзвычайных сітуацый і авіякасмічныя тэхналогіі» перамагла **каманда з Гомельскай сярэдняй школы № 30: вучань 9 класа Аляксандр ЛЁГКІ і яго настаўнік фізікі і інфарматыкі Аляксандр ГУЗАВЕЦ**. Яны прадставілі дыстанцыйную руку для дапамогі супрацоўнікам МНС і сапёрам.

— Мы лічым наш праект вельмі актуальным, таму што плануем стварыць паўнавартаснага робата — маніпулятар з кісцевым захопам, здольны паўтараць за аператарам дакладна рухі яго кісці, — расказаў педагог. — На дадзены момант ёсць шмат небяспечных для жыцця заняткаў, калі патрабуецца дакладнасць і магчымасць захопу аб'екта, напрыклад, пры абясшкоджванні бомбы, разграбанні завалаў і гэтак далей. Пры такой небяспечнай рабоце нават адна памылка можа пацягнуць цяжкія траўмы ці ўвогуле каштаваць жыцця, а паколькі аўтаматызаваць гэтыя працэсы амаль немагчыма, застаецца выконваць работу дыстанцыйна. Але для гэтага патрабуецца сапраўдная рука — максімальна набліжаная да анатамічнай чалавечай. І такая дыстанцыйная рука ў нас ужо ёсць.

Усе дэталі праекта ствараліся ў праграме для 3D-мадэлявання. Кісць выраблена на 3D-прынтары са зносаўстойлівага пластыку, які мадыфікаваны гліколем для большай даўгавечнасці. Зараз рука можа сгінаць кожны палец асобна ад астатніх, сціскаць невялікія аб'екты да пяці кілаграмаў. Яна працуе на адлегласці да 50 метраў. Яе рух забяспечваецца серваматорамі. На дадзены момант кантроль пальцаў адбываецца з дапамогай лінейных патэнцыяметраў, якія праз радыёмодуль перадаюць паказчыкі на плату кіравання Arduino Nano. У перспектыве плануем стварыць робата, які будзе рухацца самастойна на шасі з дапамогай тэлеметрыі, кіравацца аператарам дыстанцыйна і перадаваць яму выявы ў рэальным часе.

Як падкрэслівае Аляксандр Гузавец, у адрозненне ад робатаў, якія выпускаюцца ў іншых краінах, яны змогуць забяспечыць найлепшы кантроль у параўнанні з класічнай кляшнёй маніпулятара. Кісць робата будзе дакладна паўтараць за аператарам у VR-шлеме рухі яго пальцаў і кісцей. Работнікі МНС ужо зацікавіліся гэтай распрацоўкай. Педагог са сваімі вучнямі ўдзельнічаюць таксама ў конкурсе робататэхнікі «Ратавальнік будучыні» і чакаюць яго фінальнага этапу.



Аляксандр Лёгкі дэманструе дыстанцыйную руку для дапамогі ратавальнікам і сапёрам.

«Дабрыня выратуе свет» — дэвіз праекта, які прадставілі ў гранд-фінале **дырэктар ветклінікі ў Лідзе «Кот Бегемот», галоўны ветэрынарны ўрач Павел ЖУЛЬПА** і яго памочніцы — навучэнкі ўстаноў адукацыі горада. Праект перамог у намінацыі «Грамадства і сацыяльная сфера».

«Доктар «Пал Палыч», як называюць яго гаспадары гадаванцаў, якіх ён выратаваў, вядомы ў краіне сваімі аперацыямі па пратэзаванні канечнасцяў у жывёл. Апошнія могуць страціць лапы па розных прычынах: у выніку траўм, ампутацый ці стаць ахвярамі жорсткага абыходжання з боку чалавека. Першым яго пацыентам прыкладна два гады таму стаў дварняк Хопі. Гаспадар хацеў забіць сабаку і фактычна адсек яму лапу.

Усяго ў 2021 годзе ў аргкамітэт праекта паступіла 1,1 тысячы заявак і адбылося 66 адборачных тураў. На працягу года для ўдзельнікаў конкурсу арганізавана больш за сто спецыялізаваных спіч-сесій, вэбінараў і майстар-класаў па стварэнні прэзентацый, прасоўванні і рэалізацыі іх распрацовак. На перамогу ў рэспубліканскім фінале прэтэндавалі 120 аўтарскіх распрацовак у дзесяці намінацыях у дзвюх узроставых катэгорыях. А ў фінале аўтарам праектаў давялося абараняць сваю распрацоўкі перад экспертным саветам у фармаце два плюс тры: тры хвіліны ім давалася, каб расказаць пра ідэю, і дзве — на стасункі з экспертамі.

Потым пакінуў на ланцугу без дапамогі на два тыдні. Сабака сам сабе адгрыз пашкоджаную канечнасць. У клініку яго даставілі валанцёры. У выніку Хопі стаў першым сабакам у Беларусі з біянічным пратэзам. «Сёння бегае так добра, што проста не дагнаць, — усміхаецца Павел. — Не баліць, і ў сабакі ёсць надзейная апора замест страчанай лапы. Прызнаюся, для мяне гэта быў вельмі цікавы медыцынскі вопыт, першы складаны, выпакутаваны шлях да пратэзавання і вельмі дарагі ва ўсіх сэнсах пацыент» (сёння Хопі жыве ў Паўла).

Яшчэ адзін пацыент доктара — коцік Кузя з двума пратэзамі замест задніх лапак — быў наўмысна кінуты ў вогнішча і атрымаў тэрмічныя апёкі (напэўна, таму яго яшчэ называюць у клініцы Вугалёк).

Павел падкрэслівае, што праблему жорсткага абыходжання з жывёламі трэба вырашаць на заканадаўчым узроўні. А яго праект, прадстаўлены ў фінале, скіраваны на псіхалагічную рэабілітацыю дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

— Нашы пушыстыя падапечныя — асаблівыя, і дзеці — таксама асаблівыя, — тлумачыць ён. — Але калі малыя бачаць, якія каты і сабакі пазітыўныя, актыўныя, што адсутнасць лап, якія ім замянілі пратэзы, яны нават не заўважаюць і жывуць паўнавартасным жыццём, то атрымліваюць вялікі зарад энергіі і пазітыву. У іх з'яўляецца вера ва ўласныя сілы. Гэта дапамагае не здавацца. Гледзячы на тое, як рэагуюць на жывёл з пратэзамі дарослыя, мы вырашылі паказаць іх хлопчыкам і дзяўчынкам з Івянецкага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі фізічнага развіцця. Дзеці былі настолькі натхнёныя, што, гледзячы на іх, заплакалі нават мужчыны. Нашу ідэю ўжо падтрымаў фонд Аляксея Талая, мы знайшлі паразуменне і з боку Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Ідэя вельмі добрая і не пакідае раўнадушным нікога. Пазітыўных момантаў павінна быць больш!

Дарэчы, дзяўчаты, якія дапамагаюць Паўлу ва ўсім і суправаджалі яго падапечных у Мінск, на фінал конкурсу «100 ідэй», з'яўляюцца выхаванцамі «Школы юнага ветэрынара», што дзейнічае пры ветклініцы.



Павел Жульпа: «Нашы пушыстыя падапечныя пазітыўныя, актыўныя і жывуць паўнавартасным жыццём».

Гэта яшчэ адна важная сумесная з экалагічным цэнтрам сацыяльная ініцыятыва — спрыяць свядомаму выбару прафесіі. Прызнаецца, што сам ён стаў ветэрынарам... па волі выпадку. У медыцынскую ВНУ не паступіў, бо не хапіла балаў. Таму пайшоў вучыцца ў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт на ветэрынара. Вырашыў, што гэта спецыяльнасць стаіць да медыцыны бліжэй за іншыя — там таксама трэба лячыць і выратоўваць жыцці, толькі не людзей. Але потым ні разу не пашкадаваў пра здзейснены крок. Ветэрынарыя яго адразу захапіла, яму пастаянна хочацца развівацца ў сваёй прафесіі. Але так адбываецца далёка не заўсёды. Прыкладна з трох дзясяткаў дзяцей, што прыйшлі ў «Школу юнага ветэрынара», зараз засталося толькі каля дзясятка. «Добра, што прафесійны адбор адбываецца яшчэ на этапе вучобы ў школе..., — канстатуе Павел, — а атрымаць дыплом — зусім не азначае стаць высакакласным спецыялістам. Добра, калі ёсць магчымасць яшчэ да паступлення ўбачыць на свае вочы, дакрануцца і ўсвядоміць, з чым рэальна давядзецца сутыкнуцца ў будучай прафесіі».

Цікава, што ў намінацыі «Найлепшая бізнес-ідэя» таксама перамог праект, звязаны з хатнімі гадаванцамі. Яго аўтары — **навучэнцы чацвёртага курса Гомельскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа Павел БАНДАРЭНКА і Вадзім ЧЫЖЭЎСКІ** — распрацавалі шматфункцыянальную мабільную праграму для гаспадароў хатніх жывёл і GPS-трэкер для іх гадаванцаў. Месцазнаходжанне жывёліны і яе гаспадара фіксуюцца на інтэрактыўнай карце мясцовасці. Прылада валодае такімі якаснымі характарыстыкамі, як надзейнасць, дакладнасць вызначэння каардынат і хуткая іх адпраўка гаспадару, які згубіў свайго гадаванца.

Пра іншыя цікавыя праекты фіналістаў рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» мы плануем расказаць у наступных нумарах «Чырвонкі. Чырвонай змены».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



Прыкладна з трох дзясяткаў дзяцей, што прыйшлі ў «Школу юнага ветэрынара», зараз засталося толькі каля дзясятка. Верныя памочніцы ветэрынарных урачоў.

*Камертон настрою*

# СУСТРЭЦЦА З... ФРАНЦЫСКАМ СКАРЫНАМ

**Да ўдзелу ў конкурсе эсэ «Пуцявінамі беларускага пісьменства» запрашае школьнікаў БДУ. Мерапрыемства прымеркавана да Года гістарычнай памяці і накіравана на далучэнне навучэнцаў да гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі, а таксама папулярызацыю і пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы, прафесійнае самавызначэнне і развіццё творчых здольнасцяў у падлеткаў.**

Да ўдзелу запрашаюцца вучні 10-11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Конкурсантам на выбар прапаноўваецца шырокая тэматыка. Гэта могуць быць эсэ-ўражанні пра знакавыя помнікі старажытнага беларускага пісьменства, дзейнасць нашых першадрукароў і асветнікаў, аўтараў першых выданняў паэзіі і прозы XIX — пачатку XX стагоддзя, пра сустрэчы з пісьменнікамі-землякамі і наведванне выстаў і кніжных экспазіцый. Дапускаецца напісанне работ на іншую літаратурную тэматыку.

Апавяданні трэба падрыхтаваць на беларускай мове аб'ёмам не больш за чатыры старонкі друкаванага тэксту.

Матэрыялы прымаюцца да 31 сакавіка ўключна на электронны адрас часопіса «Роднае слова»: konkurs@rod-slova.by. У заяўцы абавязкова трэба ўказаць прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, назву і тэлефон навучальнай установы, клас, паштовы і электронны адрасы, а таксама звесткі і пасаду кіраўніка.

Усіх удзельнікаў конкурсу запросяць 8 красавіка на цырымонію аб'яўлення і ўзнагароджання пераможцаў. Мерапрыемства адбудзецца на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта. У гэты ж дзень школьнікі змогуць таксама прыняць удзел у вочным трэнінгу па беларускай мове і літаратуры, віктарыне «Філалогія і Я». Акрамя гэтага, старшакласнікаў пракансультуюць выкладчыкі-філолагі па паляпшэнні зместу творчых работ.

Арганізатарамі конкурсу эсэ выступаюць філалагічны факультэт БДУ і часопіс «Роднае слова». Супрацоўніцтва паміж імі мае доўгую гісторыю, апошнім сумесным праектам стаў юбілейны выпуск выдання да 100-годдзя БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*І сабе, і людзям*

# КЛУБНІЦЫ Ў ШАКАЛАДЗЕ,

## ці «Салодкі» бізнес для дваіх

**Тэма пра тое, як знайсці прыбытковую справу, мабыць, будзе актуальнай заўсёды. Ксенія ШЧАСНАЯ і Арцём БЫКОЎСКІ вырашылі для сябе гэтае пытанне. Больш за тры гады пара займаецца стварэннем і продажам падарункавых дэсертаў. За гэты час маладыя людзі адкрылі дзве майстэрні: адна з іх знаходзіцца ў Мінску, другая — у Гродне. Акрамя гэтага, у сталіцы хутка адкрыецца іх кандытарская. Мы пагаварылі з дзяўчынай аб іх сумесным «салодкім» бізнесе.**

Працаваць Ксенія з Арцёмам пачалі падчас вучобы ва ўніверсітэце. Пара ў той час актыўна займалася пошукам варыянтаў заробку. Тады і з'явілася ідэя пачаць продаж кветак анлайн, але з-за неспрактыкаванасці маладых людзей не абышлося без памылак. Адначасова з гэтым Арцём заўсёды шукаў магчымасць дадатковa падзарабіць: падпрацоўваў грузчыкам, раздаваў улёткі, палiваў газоны і гэтак далей.

Нягледзячы на тое, што па адукацыі Ксенія маркетолаг-эканаміст у сферы IT, а Арцём — інжынер-будаўнік, сваё прызванне пара знайшла ў стварэнні яркіх і прыгожых дэсертаў. Першым і галоўным іх таварам сталі клубніцы ў шакаладзе.

— Ідэя адкрыць сваю майстэрню ўзнікла тры гады таму абсалютна выпадкова, — дзеліцца Ксенія. — Мы ўбачылі, як такі дэсерт робяць у Маскве, і вырашылі паспрабаваць увасобіць тое ж самае.



Арцём і Ксенія.



Шакаладныя пліткі.



Слоічак таго самага «Варэння Дабра».

Ні ў адным бізнесе не абыходзіцца без цяжкасцяў. Але яны дапамагаюць удасканальвацца і станавіцца мацнейшым. Па словах Ксеніі, галоўнай складанасцю для іх з Арцёмам стаў падбор персаналу, бо гэта тыя людзі, з якімі трэба працаваць у далейшым. Да пытання пара падышла сур'ёзна. Крытэрыяў пры адборы было шмат, галоўнымі сталі адказнасць, акуратнасць, ветлівасць. Ад кандытараў дадаткова патрабавалася творчая загартоўка, ад менеджараў — уменне працаваць у сферы продажаў.

На пытанне аб тым, што з'яўляецца галоўным у гэтай справе, Ксенія адказала лаканічна — «любоў». І сапраўды, без належнага стаўлення да працы не атрымаецца дамагчыся добрага выніку.

Акаўнт майстэрні ў Instagram змяшчае больш за шэсцьсот публікацый, і вялікая колькасць з іх — фатаграфіі гатовых дэсертаў. Асартымент прадукцыі прыйдзецца па душы кожнаму: шакаладныя пліткі, трайфлы, капкейкі і медыянты з рознымі смакамі і напаўненнямі, свежыя фрукты і ягады ў шакаладзе, эфектны «Напалеон» і многае іншае. Салодкія кампазіцыі нярэдка ўпрыгожваюць жывыя ружы. Яркія колеры, арыгінальны дызайн, прэзентабельны выгляд — абавязковыя складнікі кожнага вырабу. У такой справе сапраўды не абысціся без натхнення!



Букет з клубніц у шакаладзе.

— Наша каманда складаецца з творчых людзей, таму варыянты новых дэсертаў з'яўляюцца па-рознаму: хтосьці малюе эскізы, некаторыя імправізуюць падчас выканання кампазіцый, а мне, напрыклад, аднойчы ідэя прыйшла ў сне. Калекцыя «Матылькі» ўзнікла пасля таго, як прысніліся гэтыя ярка-блакітныя стварэнні, — прызнаецца Ксенія.

Штодня ў майстэрнях выконваецца ад дзесяці заказаў. У залежнасці ад віду дэсерту на яго выраб патрабуецца ад 15 хвілін да 1,5 гадзіны. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца падарункавыя букеты з клубніцамі ў шакаладзе.

У адным з пастоў Instagram-акаўнта майстэрні падпісчыкам прапануецца купіць слоічак «Варэнне Дабра» і такім чынам паўдзельнічаць у дабрачыннасці.

— У нас заставалася шмат ягад, якія псаваліся, з-за чаго даводзілася іх выкідваць. Таму мы вырашылі перапрацоўваць невялікія па памерах клубніцы, што не падыходзілі для выканання заказаў, і рабіць з іх варэнне. Так прыйшла ідэя запусціць дабрачынную акцыю, а ўсе атрыманыя грошы накіроўваць у фонд дапамогі тым, хто мае ў гэтым патрэбу: дзецям, хворым на рак, пажылым, жывёлам.

Для акцыі было выраблена 30 кілаграмаў дэсерту. Аб'ём аднаго слоічка складае 300 грамаў, а яго цана — 15 рублёў.

Нядаўна Ксенія з Арцёмам паведамілі падпісчыкам нечаканую навіну: маладыя людзі пераехалі ў Маскву. Зараз у гісторыях акаўнта можна бачыць, як яны пачынаюць развіваць сваю «салодкую» справу ў сталіцы Расіі.

Акрамя вядзення бізнесу, пара любіць хадзіць у трэнажорную залу, і змена месца жыхарства ніяк не адбілася на гэтым занятку.

**Лізавета МАЛЬЧУК, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ. Фота з архіва герояў.**

# «ХАЧУ ЗАСТАЦЦА Ў ПРАФЕСІІ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Мая родная вёска знаходзіцца ў Рагачоўскім раёне, бацькі жывуць адны. Таму хацелася мець магчымасць хоць бы зрэдку іх наведваць. Таксама адметным было тое, што ў гаспадарцы для маладога спецыяліста прадугледжвалася асобнае жыллё. У наш час гэта вельмі актуальна, таму гэты варыянт адразу зацікавіў.

Але і без складанасцяў не абышлося. Адукацыю наш герой атрымліваў па спецыяльнасці «Інжынер-тэхнолаг (птушкагадоўля)», а вось працаваць давялося крыху ў іншай галіне.

— Яшчэ на другім курсе нам паведамілі, што заявак на маладых спецыялістаў з птушкагадоўчых фабрык няма, таму хутчэй за ўсё давядзецца працаваць у звычайных гаспадарках... Я гэта ўспрыняў спакойна, у навучанні пачаў больш увагі ўдзяляць асаблівасцям работы з буйной рагатай жывёлай. У любым выпадку гэта прафесія мне падабаецца.

Лагічна, што ўзнікае пытанне: чым жа прывабіла маладога хлопца праца заатэхніка? Сёння моладзь збольшага імкнецца збегчы з вёскі, таму ў сучасных рэаліях гісторыя Сямёна выглядае не зусім звычайна.

— У маёй сям'і ўсе звязаны з сельскай гаспадаркай: тата — інжынер, брат — ветурач. А мама, як і я, заатэхнік. Гэта ў пэўнай ступені паўплывала на выбар прафесіі. І жывёл я люблю.

Хутка мы ў гэтым упэўніліся. Цяжка апісаць словамі пяшчоту, з якой хлопец ставіцца да сваіх «падапечных» — каровак і цялят. І яны адказваюць яму тым жа.



## ДОСВЕД ЛІШНІМ НЕ БЫВАЕ

Першае працоўнае месца задае настрой усёй прафесійнай дзейнасці. Часам здараецца, што пасля няўдалага вопыту маладыя людзі расчароўваюцца ва ўласным выбары. Таму для дзяўчат і хлопцаў вельмі важнай з'яўляецца адаптацыя ў новым калектыве і ўвогуле ў нестандартных абставінах. Для Сямёна працоўныя будні пачаліся з прызначэння на пасаду галоўнага заатэхніка, а значыць, дапускаць памылкі было нельга.

— Адразу, прызнаюся шчыра, было страшна без вопыту прымаць на сябе такую адказнасць. Але паступова ўцягнуўся, здаецца, спраўляюся. Галоўнай цяжкасцю была работа з вялікім калектывам. Да кожнага чалавека трэба знайсці падыход, каб ён цябе пачуў, зразумеў і якасна выконваў свае абавязкі.

Для таго каб кіраваць людзьмі, трэба мець аўтарытэт. Тым больш гэта важна для маладога спецыяліста. Займець павагу вопытных, часта старэйшых па ўзросце, цяжка, для гэтага трэба шчыра і аддана працаваць. Так, каб ніхто не змог засумнявацца ў тваім прафесіяналізме. Сямён Гаянкоў гэтага правіла прытрымліваецца дакладна: працуе літаральна ад цямна да цямна.

— Мой працоўны дзень пачынаецца ў пяць гадзін раніцы. Першай справай аглядаю сваю гаспадарку: замацаваныя за мною малочна-таварныя комплексы і фермы. Затым агульная планёрка, пасля яе кантралюю раздачу кармоў, каб усе кароўкі былі сытыя. Таксама займаюся лячэннем жывёл. У абед невялікі перапынак. І пасля зноў паўтараецца ранішні сцэнарый. Працоўны дзень у мяне ненармаваны, ды і гаспадарка вялікая, таму часам даводзіцца вяртацца дамоў у восем ці дзевяць гадзін вечара.

Гэта толькі схематычнае апісанне, насамрэч жыццё кожны дзень падкідвае безліч загадак, якія маладому спецыялісту даводзіцца разгадваць.

Можа падацца, што вясковае жыццё нашага героя ў пэўнай меры сумнае. Але гэта не так. Ён знаходзіць, як бавіць вольны час. Адзіны мінус: у вёсцы не хапае моладзі.

— Люблю пагуляць з кампаніяй у валейбол ці футбол, летам магу павудзіць рыбу, калі дазваляе час. Канешне, моладзі мала. Маладыя людзі ў асноўным імкнуцца ў горад, але ж сельская гаспадарка корміць усю краіну! Калі праца належным чынам аплачваецца і ёсць дзе жыць, можна спакойна працаваць!

З такой думкай цяжка не пагадзіцца. Сучасныя студэнты як агню баяцца размеркавання. Найперш пужае перспектыва трапіць на адпрацоўку за межы Мінска ці абласнога цэнтра. Але ж і МКАДам жыццё не спыняецца. У раёнах, у невялікіх вёсках таксама жывуць людзі, якія працуюць. Магчыма, праца іх незаўважная для жыхароў тлумных шматпавярховікаў. Але ж такія маладыя людзі, як Сямён, на сваім вопыце даказваюць, што моладзь у вёсцы запатрабаваная.

Пра тое, якой ён бачыць сваю будучыню, Сямён шчыра кажа: «Хачу застацца ў прафесіі». І гэтыя словы надзвычай важныя.

Напрыканцы мы запыталі ў нашага героя, якія парады ён можа даць студэнтам, што ў хуткім часе прыйдуць на сваё першае працоўнае месца.

— Не трэба баяцца! У жыцці трэба прайсці ўсё. І чым больш цяжкасцяў ты зведаеш сёння, тым лепш будзе заўтра. Калі выбраў прафесію, трэба ёй адпавядаць, рабіць сваю справу належным чынам. Галоўнае — упартасць, цярплівасць і жаданне. І ўсё атрымаецца!

...Сонца даўно апусцілася за гарызонт. А па вясковай вуліцы шпаркай хадою крочыць малады чалавек — галоўны заатэхнік ААТ «Прывольны агра» Сямён Гаянкоў. Сёння яго чакае адпачынак. А заўтра будзе новы дзень, са сваімі выклікамі і праблемамі. Спадзяёмся, Сямён з імі справіцца.

**Алёна КУХАРАВА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ. Фота аўтара і з архіва героя.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 02 2022 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# Далей схаваеш, бліжэй знойдзеш

**І пацвярджэнняў таму — процьма. Так, раўнівая жонка, жыхарка мексіканскай сталіцы Мехіка, хавалася ў багажніку разам з сынам — шпіёніла за мужам-таксістам падчас яго начных змен. («Засынаюць муж з жонкай. Раптам шафа загаварыла: «Ну што, твой спіць?» — «Быццам бы так», — адказвае жонка. — «Ну тады я пайду?» Тут муж прачынаецца: «Куды пайшоў, я за цябе яшчэ крэдыт не аддаў!») Кліент Uber ехаў у машыне, калі кіроўца пачуў дзіўны гук з багажніка. Кіроўца адкрыў яго і ўбачыў там уласную жонку з дзіцем. Пасажыр сфатаграфаваў тое, што адбываецца, і апублікаваў здымкі на Facebook. «Уявіце, што вы едзеце ў таксі, а затым высвятляецца, што жонка кіроўцы хаваецца ў багажніку, каб шпіёніць за ім!» — напісаў відавочца. («Крыўдна, калі пасля вяселля жонка перастае сачыць за сабой. А за табой не перастае».) Адзін з карыстальнікаў Facebook зазначыў: «Яна больш клапоціцца аб тым, каб шпіёніць за сваім мужам, чым аб дзіцяці». («Не верце, калі жонка кажа, што дзеці для яе — самае дарагое. Бо іх яна можа пакінуць на суседку, а мужа — не».)**



А ў амерыканскім горадзе Мідленд, штат Мічыган, дзяўчына залезла ў багажнік (зноў ён!) аўтамабіля, каб прасачыць за знаёмай, якая праявіла цікавасць да яе каханага. («— Таня, ты ведаеш, мне цябе вельмі не хапае!» — «Праўда?!» — «Так... Прыйдзецца, мабыць, яшчэ адну бабу завесці».) 19-гадовы Джэйкаб Глазга распавёў сваёй дзяўчыне, 18-гадовай Саманце Грывальскі, што яе знаёмая спрабуе фліртаваць з ім у сацсетках. («Не кажыце, што мужчына — бабнік. Быў бы ён адналюб — да вас бы чарга не дайшла!») Калі тая знаёмая прапанавала яму сустрэцца, Саманта паехала з ім. («Генадзь не верыў у Дзеда Мароза, пакуль не застукаў яго са сваёй жонкай».) «Я хацела даведацца, як далёка яна зойдзе і што будзе рабіць з маім бойфрэндам, калі ніхто не бачыць. У трох кварталах ад месца вечарынкі той прапанаваў мне схавацца ў багажніку», — распавядала яна. Адтуль Саманта чула, што саперніца села ў машыну і загаварыла з Джэйкабам. («— А вы... замужам?» — «Ледзь-ледзь». — «Я таксама часам... жанаты».) «Давялося выслухоўваць, як яна пералічвала ўсё, чым хацела б з ім заняцца, — сцвярджае яна. — Прызнацца, не ўражвала арыгінальнасцю». Хлопец падыграў ёй і сказаў, што пашукае ў багажніку прэзерватывы. («Я саромеюся спытаць: а пасля падпісання акта на дазвол сексу ці патрэбны потым акт аб выкананні работ?») Выйшаўшы з машыны, ён выпусціў Саманту і вярнуўся ў аўтамабіль ужо з ёй. Пакуль яго не было, дзяўчына паспела зняць шорты. («Прыйшла жонка, а госці не адзетыя...») Нягледзячы на гэта, яна паводзіла сябе так, быццам нічога не адбылося, і адмаўляла ўсе абвінавачанні. «Я не толькі даведалася, хто яна такая на самай справе, але і ўбачыла, што за чалавек мой хлопец», — падсумавала Саманта. («— Чаму ты перастаў сустракацца з той дзяўчынай?» — «У яе дрэнны густ». — «У чым гэта праяўляецца?» — «Яна сказала, што я ёй не падабаюся».)

...Брытанскі вайсковец таемна правёз замежную палюбоўніцу на авіябазу Каралеўскага ваенна-марскога флоту ў Ёвілтоне, графства Сомерсет, і два тыдні хаваў яе ў шафе ў сваім пакоі. («Чаму жонка ў сваёй сяброўкі пераначавацъ можа, а муж у сваёй — не?») Жанчыну знайшлі афіцэры. Яе вывелі з тэрыторыі базы, пасля чаго яна неадкладна пакінула Вялікабрытанію... Супрацоўнік авіябазы патлумачыў, што знаёмы з ёй некалькі гадоў. Падчас святкавання Раства ён сустрэўся з ёй. («Караценька пра сябе: нішто такая... вясёленькая...») Яна збіралася вярнуцца ў Нідэрланды пасля Новага года, аднак сутыкнулася з праблемамі з прычыны эпідэміі COVID-19. Тады вайсковец вырашыў прытуліць яе на авіябазе. («Дамы, калі джэнтльмен хоча ад вас баршчу, не спрабуйце «ўцюхваць» яму секс. Раздражнее».) Вяртаючыся з водпуску, ён правёз жанчыну на ахоўную тэрыторыю ў (чым бы вы думалі?) багажніку аўтамабіля. («Усё надакучыла! Стамілася! Сыду ў манастыр! У мужчынскі... на тры дні... а можа, на чатыры? Пагляджу, як сустрэнуць...») Каб пазбегнуць выкрыцця, вайсковец павесіў на дзверы памяшкання таблічку з надпісам «Не ўваходзіць, аб прыборцы паклапоцімся самі». («Давядзі да аргазму і далей можаш не праводзіць».)

...У Індыі мужчына, які 11 гадоў хаваў каханую ў зачыненым пакоі (чым не той самы «хатні багажнік»?) у доме бацькоў, нарэшце ажаніўся з ёй. Рахман і Саджыта праславіліся, калі высветлілася, што дзяўчына, якая лічылася зніклай шмат гадоў таму, таемна жыла ўвесь гэты час разам з любімым чалавекам. («— Учора прачнуўся, а цябе няма. Дзе ты была, дарагая?» — «А дзе ты прачнуўся, дарагі?») Аднак нават родныя мужчыны не падазравалі пра гэта, бо яна знаходзілася ў пакоі, куды ён нікога не пускаў. Саджыта выбіралася на вуліцу толькі па начах праз акно. («Калі існуюць хатнія гаспадыні, недзе павінны быць і дзікія».) Пасля буйной сваркі з бацькамі Рахман з каханай таемна з'ехалі ў суседнюю вёску і арандавалі там дом. Цяпер іх саюз нарэшце стаў афіцыйным. («Бабуля, гледзячы на вясельны картэж: «Ну вось, яшчэ адну павезлі посуд мыць...») Праўда, традыцыйную індыйскую цырымонію правесці не ўдалося, бо бацькі мужчыны былі супраць шлюбу. («Мама, ён пачаў цікавіцца маім мінулым!» — «Трэба разводзіцца, з такім у цябе няма будучыні».) Вось такі багаж гісторый...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Зрабіла крок да мары — стаць салісткай опернага тэатра»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Педагогі параілі пайсці на падрыхтоўчае аддзяленне. Але мне не хацелася прапускаць год, таму вырашыла, што лепш паступлю ў музычны каледж. Так пачаліся гады карпатлівай работы з педагогам Вольгай Аляксандраўнай Косаравай. Мне вельмі пашанцавала — яна выхоўвае выдатных вакалістаў. У яе ёсць педагагічная інтуіцыя...

На трэцім курсе мы паехалі ў Калінінград на конкурс «Бурштынавы салавей» — гэта было складаным выпрабаваннем. Там выступалі спевакі з 16 краін свету, і ў сваёй узроставай катэгорыі я заняла трэцяе месца. Была невымоўна рада, таму што, слухаючы іншых выканаўцаў, зразумела, наколькі наш свет багаты на таленты. Да гэтага мне здавалася, што вакальны свет маленькі, дзе ўсе адно аднаго ведаюць. А высветлілася, што ёсць дзесяцігадовыя дзеці, якія цудоўна спяваюць. Вяртаючыся ў Мінск, зразумела, што трэба працаваць у тры-чатыры разы больш, чым раней. Пасля гэтага конкурсу мяне занеслі ў фонд таленавітай моладзі, і, скончыўшы чацвёрты курс, я паступіла ў Акадэмію музыкі без іспыту.

***— Раскажыце, аб студэнцкім жыцці. Ці моцна адрозніваюцца студэнты Акадэміі ад моладзі, якая атрымлівае адукацыю ў іншых сферах?***

— На працягу пяці гадоў навучання я не перастаю здзіўляцца той творчай атмасферы, якая пануе ў акадэміі. Такога, канешне, няма ні ў адной ВНУ. Людзі, звязаныя з музыкай, — вельмі цікавы, спецыфічны калектыў. Так, канкурэнцыя прысутнічае, але нас аб'ядноўваюць канцэрты і спектаклі, якія мы сумесна арганізоўваем. Да пятага курса становіцца зразумела, хто сваё жыццё з музыкай звяжа, а хто — не. Нехта сыходзіць, усведамляючы, што далёкі ад мастацтва. Гэта сур'ёзная фізічная і маральная праца: складана выхаваць сябе ў атмасферы канкурэнцыі і пры гэтым застацца чалавекам, які разумее і чуе іншых.

***— Якія ўражанні засталіся ад выступлення на канцэрце, прысвечанага ўручэнню прэміі Прэзідэнта?***

— Напэўна, гэта быў адзін з самых прыгожых і запамінальных канцэртаў, дзе я прымала ўдзел. Пачынаючы ад задумкі і пастаноўкі — наколькі гэта было маштабна, напоўнена цікавай музыкай. Пераважала класіка — чаму я, як акадэмічная спявачка, была вельмі рада. Але і эстрада паказала сябе цудоўна. Гэта было сапраўднае свята музыкі для ўсіх. Хачу адзначыць і пераемнасць пакаленняў, таму што дзеткі, якія пакуль толькі вучацца ў музычных школах, выступалі разам з народнымі артыстамі.

Для мяне сапраўдным святам і прафесійнай перамогай было і тое, што я стаяла на адной сцэне з Уладзімірам Громавым і Анастасіяй Масквіной. Гэта менавіта тыя выканаўцы, спектакль якіх я ўбачыла, калі ўпершыню прыйшла ў Оперны тэатр.

Разумеючы ўзровень адказнасці, я адчувала творчае хваляванне. Спявала найскладанейшую арыю для сапрана, майго голасу. У ёй задзейнічаны асаблівыя прыёмы алегата і апартамента. Трэба было праспяваць так, каб арыя не выглядала вульгарна. Гэта свайго роду сусветны оперны хіт, і, канешне, калі выконваеш такую вядомую партыю, да цябе прыслухоўваюцца больш уважліва. Трэба было прадэманстраваць майстэрства. У любым выпадку, няма мяжы дасканаласці, але на сённяшні дзень я лічу, што ў поўнай меры адолела пастаўленую задачу.



***— Пасля канцэрту пра вас загаварылі яшчэ больш, называюць узыходзячай «зоркай». Ці з'явілася пачуццё, што зараз вы ў большай ступені адказныя перад слухачом?***

— Я атрымала вялікую колькасць прыемных водгукаў. Мне пісалі, тэлефанавалі, на оперным балі да мяне падыходзілі людзі з пажаданнямі. Гэта самая галоўная ўзнагарода і каштоўнасць для артыста — водгук публікі, для якой працуеш. Вядома, адчула большую адказнасць. Цяпер не маю права паніжаць планку. Як студэнтка зрабіла высновы, над чым яшчэ трэба папрацаваць і на што звярнуць увагу.



Я зрабіла вялікі крок да сваёй мары — стаць салісткай нашага опернага тэатра, які вельмі люблю. Дзеля гэтага і пачала займацца спевамі. Вельмі хачу радаваць людзей сваёй творчасцю.

***— Анастасія, што вас натхняе?***

— У першаю чаргу мая сям'я. Яна падтрымае, разумее, недзе паўшчувае — артыста фарміруе не толькі творчая дзейнасць, але і асяроддзе, у якім ён знаходзіцца. Мне ў гэтым плане вельмі пашанцавала, бо ўсе вельмі зацікаўлены ў тым, каб я стала прафесіяналам. Мой муж далёкі ад музыкі, але да таго, як сышла ў дэкрэт, мы часта наведвалі оперныя спектаклі.

Мяне натхняе і мой педагог, які бязмежна ў мяне верыць. У любой сітуацыі яна падтрымае добрым словам — гэта мая творчая апора.

***— Калі ласка, падзяліцеся сваімі творчымі планамі...***

— Як і ў кожнага студэнта Акадэміі музыкі, які выпускаецца ў гэтым годзе, творчы план у мяне складаецца з аднаго пункта — паспяхова размеркавацца. Але я шчыра веру ў тое, што рана ці позна траплю ў наш оперны тэатр.

***— Што вы пажадалі б маладым выканаўцам, якія знаходзяцца ў пачатку творчага шляху, але мараць выступаць на вялікай сцэне?***

— У першую чаргу — упэўненасці, ніколі не сумнявацца ва ўласных сілах, бачыць канчатковую мэту. І ніколі не здраджваць сваёй мары, што б ні здаралася. Станаўленне артыста — вельмі складаны працэс. Падчас яго з'яўляецца шмат пытанняў, на якія не заўсёды атрымліваецца знайсці адказ. Таму нельга адчайвацца, трэба сур'ёзна займацца і верыць, што ўся праца, пакладзеная на алтар мастацтва, дасць свой плён.

**Арына КАРПОВІЧ.**

**Фота дадзены гераіняй.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 23.02.2022 г.

## Извещение о проведении 28 марта 2022 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Азарэнне»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики и местонахождение предмета торгов (продаваемого имущества) | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-20991 общей площадью 276,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Путепроводный 6-й, д. 11, наименование: литер А1/К здание продовольственного магазина, назначение: здание специализированное розничной торговли | Право аренды на земельный участок площадью 0,1275 га по 31.03.2028, кадастровый номер – 500000000006004369 | 476 200,0 | 47 620,0 |

**Продавец имущества:** ОАО «Азарэнне», ул. Харьковская, 54а, 220073, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Азарэнне», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 28.03.2022.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **28 марта 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 24.02.2022 по 24.03.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 636 63 66, (044) 506 16 54.

**Телефоны для справок:** (017) 365 48 36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 636 63 66, (044) 506 16 54 (ОАО «Азарэнне»). Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 20 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «РАДИОВОЛНА»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов, краткая характеристика** | **Лот № 1 – капитальное строение инв. № 400/U-162753** (незавершенное законсервированное капитальное строение) общей площадью 6520,4 кв. м, стены – панели железобетонные, кирпич силикатный, инженерные системы отсутствуют; **капитальное строение инв. № 400/С-163014** (благоустройство) общей площадью 474,0 кв. м, 1990 г. п. |
| **Информация о земельном участке** | Кадастровый номер 440100000002011232, площадь – 0,6679 га, назначение – для строительства и обслуживания здания и сооружений, право аренды по 27.10.2051 г. При переходе права собственности на незавершенное законсервированное капитальное строение и права аренды на земельный участок, возможно использование их новым собственником для размещения промышленных предприятий, транспортной и инженерной инфраструктуры, коммунальных, коммунально-складских и складских объектов, обеспечивающих функционирование этих предприятий |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., г. Гродно, ул. М. Горького, 89 Б** | |
| **Начальная цена с учетом НДС: 1 568 649 рублей 60 копеек** | Задаток (5 %) – 78 432,00 рублей |
| **Сведения о продавце:** ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. Горького, 89, тел. 8 (0152) 626648 | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, УНП 500481906, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 15 рабочих дней с момента проведения торгов. **Условия оплаты:** в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи | |
| **Торги состоятся 25 марта 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | |
| **Срок подачи документов** | **По 21 марта 2022 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** |
| Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by, тел. для справок 8 (0152) 621632 | |
| Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 27.11.2021 г., от 28.01.2022 г. | |

## Информация о проведении аукциона 28 марта 2022 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в ag. Барсуки, дер. Осово, дер. Приборье, дер. Заброденье Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

*Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет, 222161, г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Барсуки | 624881701101000472 | 0,0937 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 16 000.00 |
| 2 | дер. Осово | 624881712101000125 | 0,15 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 5 000.00 |
| 3 | дер. Приборье | 624881712101000124 | 0,15 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 10 000.00 |
| 4 | дер. Заброденье | 624881706101000102 | 0,1498 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 5 000.00 |

**Аукцион состоится 28 марта 2022 г. в 11.00 в Жодинском сельском и исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д 3, кабинет № 1.**

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Смолевичского райисполкома: http://www.smolevichi.gov.by.

УНП 600023532

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

### ЗДАНИЯ ХОЛОДИЛЬНИКА 100

***(составные части и принадлежности: теневой навес)***

**с инв. № 620/С-37423 общей площадью 375,9 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622250100001005464 (право аренды по 06.07.2120) площадью 0,4812 га по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Омельянюка, 5.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: природная территория, подлежащая специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), площадь 0,4738 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 200 493,77 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **20 049,00 бел. руб.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **29.03.2022 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.03.2022 до 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801716) 649-33, (8029) 578-35-46.**

УНП 600037767

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «Космоопт» (продавец) в лице ликвидатора ООО «Космоопт» Будкова К.В. извещает о проведении 29 марта 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА с ценами и размером задатка по лотам №№ 1–107 размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** г. Гомель, ул. Ильича, 297А

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «Космоопт», 220030, г. Минск, ул. Зыбицкая, 4, оф. 24.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (029) 698-07-48 – Будков Кирилл Виктрович** – ликвидатор ООО «Космоопт» (правовая информация, предварительная запись на осмотр имущества). **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 февраля 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 25 марта 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить все затраты, связанные с организацией и проведением торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами и размером задатка по лотам размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

УНП 194905378

## ОТЧЕТ Местного фонда «Поддержка тенниса» (далее – Фонд) об использовании своего имущества за 2021 год

Утвержден Протоколом Правления Фонда от «16» февраля 2022 № 01

| № п/п | Сведения, обязательные для включения в состав отчета | Информация Фонда |
|---|---|---|
| 1 | Информация о количестве учредителей фонда | 1. Республиканское общественное объединение «Белорусская теннисная федерация» |
| 2 | Информация о стоимости имущества фонда | В отчетном периоде:<br>2.1. передано учредителем – 0,00 бел. руб.<br>2.3. поступления от проводимых в соответствии с уставом Фонда мероприятий – 0,00 бел. рублей.<br>2.4. доходы, полученные от осуществления в соответствии с уставом Фонда предпринимательской деятельности – 0,00 бел. рублей.<br>2.5. иные, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, поступления – 209 542,35 бел. рублей |
| 3 | Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе | В отчетном периоде общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда – 209 667,44 бел. рублей |
| 4 | Информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии фонда в таких юридических лицах | Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях |

# РЫЖСКІЯ ТУРБОТЫ

## Чаму жыхары Латвіі вымушаны пакласці зубы на паліцу?



**За апошні год у Латвіі зафіксаваны самы імклівы рост цэн на прадукты харчавання — 7,9 працэнта, паведаміла Delfi. Апошні раз падобныя паказчыкі інфляцыі ў Латвіі былі зафіксаваны ў 2011-м. Па словах дырэктара дэпартамента макраэканамічнай статыстыкі Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення Латвіі Інтарса Абражунса, у мінулым месяцы цэны на прадукты харчавання ўжо выраслі на 9,4 %. Больш за ўсё ў студзені падаражала агародніна. У параўнанні з мінулым годам, яе кошт у сярэднім вырас больш чым на 20 %. Аднак за капусту, рэпчатую цыбулю і моркву жыхары зараз плацяць на 30 % больш. Таксама даражэйшымі сталі алеі, малако, сыр і яйкі. Хлеб і зерневыя прадукты за год у сярэднім падаражэлі на 10 працэнтаў. Акрамя таго, Інтарс Абражунс заявіў, што некаторыя прадукты, напрыклад, бульба і грачаныя крупы, сталі даражэйшымі на 60 %. Эксперты прагназуюць, што ў найбліжэйшай перспектыве цэны не знізяцца. Чаму жыхары Латвіі вымушаны пакласці зубы на паліцу?**

### НЕПАД'ЁМНЫЯ РАХУНКІ

Рахункі за электрычнасць жыхароў краіны выраслі ў два, а то і ў тры разы. Растуць камунальныя плацяжы і транспартныя выдаткі і цэны на прадукты. І гэтак жа расце незадаволенасць латвійцаў. Рыжанін Яніс быў шакаваны рахункам за электрычнасць, паскардзіўся ён Baltnews. Па словах мужчыны, кошт за святло ў памяшканні ў 65 квадратных метраў вырас у два з паловай раза. «Я чую, што цэны растуць, але адна справа — чуць, а другая — убачыць гэты нязвыкла вялікі рахунак. Вядома, спачатку не так адчувальна, але ў доўгатэрміновай перспектыве гэта сур'ёзна скарэктуе сямейны бюджэт і выдаткі», — узрушана заўважыў мужчына.

Рыжанін Ігар расказвае, што праблема аплаты рахункаў з новым цэнамі не стаіць востра ў яго сям'і. Аднак мужчына прызнаецца, што гэта стала для яго чарговым расчараваннем у рашэннях латвійскага ўрада. «Я такіх рахункаў яшчэ не бачыў. Гэта праблема для сярэдняга класа — усё аплаціць, а як выжываюць малазабяспечаныя і пенсіянеры, я нават не ўяўляю. І шкада, што ад дзяржавы няма ніякай падтрымкі».

Латвійка Агнеса расказвае, што ў яе офісе, дзе 30 квадратных метраў, цана за электрычнасць таксама вырасла амаль у палову. «Пачынаеш задумвацца, а ці можам мы дазволіць сабе гэта памяшканне зараз?» — задаецца пытаннем яна. Жыхар Даўгаўпілса Арцём распавёў, што яго малы бізнес з цяжкасцю вытрымаў пандэмію, і зараз мужчына не ведае, ці зможа пацягнуць гэтыя выдаткі. «З лютага тарыф на цеплаэнергію павялічваецца больш чым на палову, гэта істотна, бо, улічваючы ковід, прыбытку не становіцца больш», — заўважыў Арцём.

Нагадаю, што ў снежні мінулага года ў Даўгаўпілсе аб'явілі энергетычны крызіс. Дэпутаты горада падрыхтавалі рашэнні для яго пераадолення. Самакіраванне ўжо звярталася да ўрада па дапамогу ў вырашэнні энергетычнай праблемы і атрымала адмову. Мінэканомікі запэўніла, што ў Латвіі дастаткова энергарэсурсаў, такіх як электраэнергія, газ і нафтапрадукты, і на ўсіх іх хопіць. Такім чынам, кажуць чыноўнікі, сістэма энергазабеспячэння працуе як мае быць, а энергетычнага крызісу, аб якім раней заявілі ў Даўгаўпілскім самакіраванні, у краіне няма.

### ЯК ПРАЖЫЦЬ?

З-за росту спажывецкіх цэн і камунальных плацяжоў палова жыхароў Латвіі пераглядае свае штодзённыя выдаткі. Яны, у прыватнасці, пакрываюць іх за кошт назапашванняў, адмаўляюцца ад запланаваных пакупак і паслуг. Такія вынікі паказала апытанне, праведзенае банкам Citadele і агенцтвам Norstat. Па выніках даследавання, эканоміць пачалі больш за палову (57 працэнтаў) жыхароў Эстоніі, 50 % — Латвіі і 45 % — Літвы. У Латвіі з такой неабходнасцю часцей сутыкаюцца жанчыны ва ўзросце ад 60 да 74 гадоў.

Сярод латвійцаў, напрыклад, каб стварыць «падушку бяспекі», 32 працэнты апытаных адмовіліся ад раней запланаваных буйных пакупак, 13 % гатовыя пакрываць узрослыя выдаткі на прадукты харчавання і камунальныя плацяжы за кошт назапашванняў, 18 % — адмаўляюцца ад штодзённых паслуг.

А 12 % апытаных жыхароў Латвіі нават гатовыя браць дадатковую працу, каб павялічыць заробак. Часцей пра гэта гаварылі маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 29 гадоў, жыхары Рыгі і яе ваколля, заробак якіх складае ад 351 да 550 еўра за месяц.

Толькі 6 % латвійцаў гатовы папрасіць грошы ў доўг, каб аплаціць свае рахункі. І толькі 12 % рэспандэнтаў не заўважылі росту спажывецкіх цэн. У Эстоніі гэты паказчык складае 17 %, у Літве — 15 %.

У найбліжэйшыя месяцы ў Латвіі будуць павялічвацца цэны на прадукты харчавання, таму што расце кошт электраэнергіі, сказаў мясцовым СМІ рытэйлер SIA «Elvi Latvija». Адзначаецца, што апошнія месяцы многія вытворцы тавараў рэгулярна інфармуюць пакупнікоў аб паступовым павышэнні цэн у розных групах тавараў. Чакаецца і падаражэнне імпартнай прадукцыі.

«Многія краіны ўжо прымаюць рашэнні аб падтрымцы кампаній і вытворцаў у зніжэнні кошту тавараў, і гэта сведчыць аб тым, што цэны будуць залежаць ад падтрымкі, што аказваецца рознымі краінамі для ўмацавання сваіх кампаній», — адзначыла камерцыйны дырэктар Elvi Latvija Лайла Вартукаптэйнэ, дадаўшы, што зараз няма карэляцыі паміж ростам цэн і краінай вытворчасці.

Рост цэн на прадукты харчавання жыхары Латвіі, магчыма, адчуюць яшчэ больш балюча, чым рост тарыфаў на энергарэсурсы, адзначыў на сайце Банка Латвіі makroekonomika.lv эканаміст цэнтральнага банка Іева Апманэ. «Што ж рабіць латвійскаму спажыўцу, які не мае магчымасці выгадаваць у агародзе для сябе кроп і бульбу? Мы не можам чакаць, што дзяржава будзе кампенсаваць рост усіх магчымых цэн, але, верагодна, на працягу гэтага года ўсё больш актуальным будзе станавіцца пытанне аб падтрымцы менш матэрыяльна забяспечаных груп насельніцтва», — падкрэсліў Іева Апманэ.

### УРАД — У АДСТАЎКУ

Грамадскасць б'е трывогу. Латвійская федэрацыя пенсіянераў напісала адкрыты ліст кіраўнікам краіны, у якім выказвае занепакоенасць умовамі жыцця сацыяльна неабароненых пластоў насельніцтва ў кантэксце імклівага росту цэн. Латвійская гандлёва-прамысловая палата патрабуе ад улад неадкладна прыняць меры для паляпшэння ўмоў жыцця тых, хто мае ў гэтым патрэбу. Партыя «Саюз «зялёных» і сялян» крытыкуе чыноўнікаў за бяздзейнасць і абяцае сабраць подпісы за адстаўку прэм'ер-міністра, калі «ніякіх дзеянняў не будзе зроблена». Кіраўнік парламенцкай фракцыі СЗК Улдзіс Аўгуліс ставіць пытанне рубам: «Улічваючы, што трывожныя званочкі аб фактычным банкруцтве многіх хатніх гаспадарак не пачутыя, парламентарыі папярэджваюць: знізце цяжар рахункаў або прызнайце сваю некампетэнтнасць і пакіньце пасады».

Дзеянні ўрада назвала галоўнай пагрозай для латвійскай эканомікі ў размове з Baltnews незалежны эканаміст Яўгена Зайцава. «Што мы маем? Інфраструктура горада паціху руйнуецца пад выглядам клопату аб насельніцтве ў выглядзе веладарожак. Патрацілі вар'яцкія грошы на слупкі, якія часткова ўжо знесены зараз пры першым снегападзе. Далей — не змаглі элементарна справіцца з вывазам снегу, — заўважыла эксперт. — Гэты новы ўрад у Рызе вар'яцкі, не ўмее кіраваць. Тое ж самае з урадам Карыньша, ён знаходзіцца на такім жа ўзроўні. Яны ж не кіруюць. Яны нешта прымаюць, вынік — народ пакутуе, эканоміка абвальваецца. Напрыклад, уводзяць абмежаванні, а вынік — хворых столькі ж, як у Эстоніі, дзе абмежаванняў на парадак менш».



Дэпутат латвійскага Сейма Любоў Швяцова лічыць, што найбольш эканоміцы краіны пагражаюць энергетычны крызіс і інфляцыя. «Латвія не выкарыстоўвае інструменты пратэкцыянізму, таму вельмі моцна залежыць ад знешніх рызык — эканамічных і ў тым ліку геапалітычных. Адна з асноўных рызык, якая будзе датычыцца Латвіі ў 2022 годзе, — гэта рост інфляцыі, — заўважыла дэпутат. — Калі яна не будзе нейкім чынам спынена, ураўнаважана інструментамі фіскальнай палітыкі ці, скажам, Еўрапейскі саюз не будзе канцэптуальна думаць аб вырашэнні такіх праблем і рызык, гэта можа дэстабілізаваць эканамічную і сацыяльную сітуацыю ў грамадстве і краіне».

### НА МЯЖЫ БЕДНАСЦІ

Прэм'ер-міністр Крыш'яніс Карыньш прызнае, што недаацаніў крызіс. «Прааналізаваўшы бягучую сітуацыю, мы прыйшлі да высновы, што рост цэн больш шырокі і грунтоўны, чым гэта ўяўлялася пару месяцаў таму. Бягучых дапамог будзе недастаткова», — заявіў ён, дадаўшы, што ўрад зацвердзіў пяць розных відаў падтрымкі на агульную суму амаль 200 мільёнаў еўра.

Але пакуль партыі кіруючай кааліцыі спрачаліся аб зніжэнні ПДВ на энергарэсурсы, людзі працягваюць атрымліваць завоблачныя рахункі. Тым часам рост вытворчых затрат, выкліканы падаражэннем электраэнергіі і газу, правакуе імклівы рост цэн на прадукты харчавання. Пенсіянерка Жанна купляе ў супермаркеце толькі самае неабходнае і з абурэннем глядзіць на касавы чэк.

Узляцелыя цэннікі выклікаюць шок і ў мясцовых жыхароў. І галоўнае, што, паводле слоў кіраўніка Цэнтра прасоўвання сельскагаспадарчага рынку Інгуна Гулбе, гэта яшчэ не мяжа: «На гэты момант рост цэн — тое, што кожны заўважае, але трэба сказаць, што ён яшчэ не дасягнуў максімуму».

Амаль чвэрць насельніцтва Латвіі знаходзіцца на мяжы беднасці, і доля павялічваецца. У 2019 годзе рызыцы беднасці падвяргалася 21,6 працэнта насельніцтва, а ў 2020 годзе — ужо 23,4 працэнта. А на фоне Еўропы ў Латвіі другое месца пасля Балгарыі. У Літве і Эстоніі сітуацыя лепшая (20,9 і 20,7 працэнта адпаведна), але яшчэ ўсе прыбалтыйскія краіны адстаюць ад сярэдняга паказчыка па Еўрасаюзе (17,1 працэнта).

Што гэта значыць у паўсядзённым жыцці і як жыць у галечы, ведае пенсіянерка Тацяна, якую журналісты LTV сустрэлі ў адной з «супавых кухняў» Рыгі. Яна прыязджае сюды ўжо 10 гадоў, каб атрымаць абед для сябе і сваёй 91-гадовай маці. Дзве пенсіі пажылых жанчын складаюць каля 550 еўра, і толькі таму, што іх двое, неяк можна звозіць канцы з канцамі. У крамах Тацяна дазваляе сабе ўсё менш і менш, цэны становяцца ўсё вышэйшыя.

Цана 400-грамовай упакоўкі піражкоў са шпікам непрыемна здзівіла карыстальнікаў сацсетак у Латвіі, піша Press.lv. Калі раней каробка каштавала 1,50 еўра, то цяпер яе кошт узляцеў да 8,29 еўра. На гэтую тэму разгарнулася бурная дыскусія. Латвійцы падлічылі, што кілаграм піражкоў будзе каштаваць 20,72 еўра. Пры гэтым латвійцы правялі падлікі суадносін сярэдняга заробку большасці людзей у краіне. У выніку карыстальнікі прыйшлі да высновы, што традыцыйны латвійскі ласунак на сняданак змогуць дазволіць сабе далёка не ўсе. Тое ж, пэўна, і са шпротамі — не рыжскія шпроты, а рыжскія турботы.

### МЯДЗВЕДЖЫ КУТ

Дзяржкантроль Латвіі яшчэ два гады таму не ўтрымаўся ад рэзкай ацэнкі недахопаў у палітыцы па скарачэнні беднасці, падкрэсліўшы, што і без таго невялікія сродкі не заўсёды выкарыстоўваюцца мэтанакіравана. Акрамя таго, скарачэнне беднасці залежыць не толькі ад дапамог, але і ад занятасці, аховы здароўя, адукацыі і падатковай палітыкі, у Латвіі не было дакладнага плана дзеянняў — як міністэрствы будуць супрацоўнічаць і хто будзе каардынаваць гэтую працу. За два мінулыя гады большасць рэкамендацый Дзяржкантролю, прадстаўленыя для рэалізацыі да пачатку бягучага года, так і засталіся на паперы — пачынаючы з паўнацэннага перагляду сістэмы дапамог.

Між тым і ў Міжведамасным каардынацыйным цэнтры, і ў Міністэрстве дабрабыту не згодны з крытыкай. На думку чыноўнікаў, палітыка льгот паступова перагледаецца, і работа працягваецца, заўважыла LTV. Але, маўляў, грошай не хапае. Мара Сіманэ, кансультант аддзела планавання каардынацыйнага цэнтра, адзначае, што праблема не ў адсутнасці планаў або няўзгодненасці дзеянняў, а ў фінансавых магчымасцях для рэалізацыі мэт Нацыянальнага плана на 2021—2027 гады. «Міністэрства дабрабыту першапачаткова падлічыла, што толькі для гэтых дапамог неабходна 1,28 мільярда. Але тое, што ў нас ёсць у фінансавай прасторы, складае 300 мільёнаў на гэтыя сем гадоў. Дзе мы возьмем у тры разы больш?» — пытаецца яна. Акрамя таго, Міндабрабыту мяркуе, што няма чаго чакаць у плане значнага паляпшэння паказчыкаў беднасці, паколькі эканамічная сітуацыя ў адносінах да багацейшых краін такая, якая ёсць. «Мы ніколі не будзем у лепшым становішчы, бо наш унутраны валавы прадукт і даход на душу насельніцтва значна ніжэйшы, чым, скажам, у Германіі і Фінляндыі», — заявіла намеснік дзяржсакратара Эліна Цэлміня.

Тым часам стала вядома, што дзікія жывёлы адваёўваюць Рыгу: жыхары сталіцы ўсё часцей сустракаюць іх у межах горада. Кабанамі ў Рызе ўжо даўно нікога не здзівіць: былі выпадкі, калі дзікія свінні ўначы падыходзілі нават да галоўнага манумента дзяржавы — помніка Свабоды і бегалі па плошчы там, дзе днём стаіць ганаровая варта, нагадаў Sputnik. А цяпер ужо да таго дайшло, што структуры, якія займаюцца вырашэннем розных лясных праблем вакол сталіцы, вучаць жыхароў горада, як сябе паводзіць, калі тыя сустрэнуцца нос у нос з мядзведзямі... Пакуль клышаногіх — сваякоў нацыянальнага латышскага героя Лачплесіса — бачылі толькі ў невялікіх правінцыйных мястэчках. Аднак ніхто не дае гарантый, што мядзведзі ляснымі сцежкамі не дойдуць і да Рыгі.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ТРАГЕДЫЯ І БОЛЬ ВЁСКІ ГАІ

## Білі прыкладамі і гналі па вуліцы

***З кнігі «Памяць» Магілёўскага раёна 1996 года выдання:***

*...Знішчэнне насельніцтва, населеных пунктаў разам з жыхарамі або часткай іх, тактыка «выпаленай зямлі» — усё гэта было характэрным у час гітлераўскай акупацыі на Магілёўшчыне. Толькі ў Магілёўскім раёне такі лёс спасціг 27 населеных пунктаў, з якіх 6 былі сцёртыя з паверхні зямлі цалкам да апошняй хаты. Гітлераўцамі было забіта 2499 мірных жыхароў, з іх больш за 700 спалена жывымі...*

Жоўты дом Софіі Вераксы стаіць на ўзгорку, на ім — зорка ветэрана. Муж яе, Іван Іосіфавіч, таксама ўраджэнец вёскі, юнаком збег у партызаны, ваяваў на фронце, быў цяжка паранены. Яго баявы шлях адзначаны ўзнагародамі. Шлюбам яны пабраліся ўжо ў мірны час. Калі пачалася вайна, Софіі было ўсяго 13 гадоў. Яна ўспамінае, як разам з аднавяскоўцамі хавалася ў бліндажы, які яны зрабілі на некалькі сем'яў з бярвення наўпрост у рове. Немцы так «бамбілі горку, дзе заселі міліцыянеры», што, здавалася, хутка сатруць яе разам з вёскай ушчэнт. Паветра звінела ад свінцовага дажджу. А потым усё сціхла, і на вясковай вуліцы з'явіўся першы немец. Ён ішоў як гаспадар, з біклагай у руцэ. Людзі спачатку падумалі, што гэта бомба, баяліся пашавяліцца. Але ён нікога не крануў. Так пачалася акупацыя. Спачатку ўсё было дастаткова мірна, потым пайшлі аблавы.



**Софія ВЕРАКСА**
**ўспамінае трагічныя падзеі вайны.**

Софія Іванаўна добра памятае той летні дзень 1942 года. Немцы прачэсвалі дамы ў пошуках зброі. Вёска непадалёк ад лесу, нехта данёс, што жыхары перадаюць патроны і зброю партызанам. Гэтага дабра пасля баёў у акрузе было шмат. А жыхары яго збіралі.

Суразмоўніца лічыць, што толькі цуд выратаваў яе сям'ю. У іх доме таксама пабывалі фашысты, але не здагадаліся адкрыць чамадан, які стаяў пад ложкам. Там ляжаў тол.

— Усе ў пасёлку рыхтаваліся да таго, што нашы вернуцца, ва ўсіх былі зброя і патроны, — кажа яна. — Па начах прыходзілі партызаны, немцы абыходзілі вёску днём. Мы ўвесь час жылі ў страху.

А вось Ядвізе Бардзілоўскай не пашчасціла. Немцы знайшлі ў яе шмат зброі і кулямёт. Жанчыну схапілі, пачалі катаваць, сыпалі пясок у рот. А потым пагналі па вуліцы і ўвесь час білі прыкладамі па галаве, плячах, нагах.

— Гэта было вельмі жахліва, — успамінае Софія Іванаўна. — Немцы прымусілі, каб мы сталі ўздоўж вуліцы і глядзелі на гэта. Жанчына ледзь перастаўляла ногі, падала знясіленая, яе падымалі і гналі прыкладамі зноў. Потым з найбліжэйшага бярэзніку раздаліся стрэлы.



**Сведка злачынстваў у гады нямецкай акупацыі Браніслаў ДАШКЕВІЧ з жонкай Раісай ЗНОСАК.**

Ядвігу Бардзілоўскую ў пасёлку лічылі сапраўднай шляхцянкай: бойкая, самавітая, дзелавая. Муж ваяваў на фронце, а яна жыла з двума дзецьмі і маці. Потым да іх далучыўся яе брат, які падчас баёў атрымаў калецтва. Яшчэ да аблавы ён збег з дому, дзеці таксама адсутнічалі. Старую маці немцы не кранулі, затое на яе вачах здзекаваліся з дачкі.

Ядвігу Бардзілоўскую там, у беразняку, і пахавалі. Гэта магіла ёсць і цяпер. Летась яе паставілі на ўлік як воінскае пахаванне. Сціплая агароджа, бярозка з раздвоеным ствалом замест крыжа, штучныя кветкі і шыльда з яе прозвішчам і датамі жыцця — 1902—1942. Самастойна мы гэта месца дакладна не знайшлі б. Дачы амаль цалкам узялі яго ў кола. Дзякуй Раісе Зносак, жонцы яшчэ аднаго сведкі тых часоў — Браніслава Дашкевіча. Яна нам яго і паказала.

## Снарады хаваў у хляве

***З кнігі «Памяць»:***

*«Нацысцкае камандаванне заклікала салдат і афіцэраў праяўляць неабходную жорсткасць да насельніцтва. 13 мая 1941 года фельдмаршал Кейтэль падпісаў дырэктыву «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і аб асобных паўнамоцтвах войск». У ёй гаварылася, што ўзброеныя сілы Германіі вызваляюцца ад усякай адказнасці за любыя злачынствы на акупіраванай тэрыторыі».*

Браніслаў Дашкевіч на год старэйшы за Софію Вераксу. Быў настаўнік, шмат цікавага ведае з гісторыі сваёй вёскі. І, што вельмі прыемна, наш падпісчык. З газетай сябруе шосты дзясятак гадоў, яна і зараз у яго на стале. Падчас вайны таксама збіраў зброю для партызан. Нават прыдумаў цэлы план, каб рабіць гэта непрыкметна для іншых. Чапляў на доўгі провад і паціху цягнуў за сабой. Хаваў у хляве пад страхой. Падчас адной з аблаў таксама ледзь не стаў ахвярай. Немец ужо глядзеў у бок гэтага хлява, але не стаў пэцкаць свае боты ў каровіным гноі.

— Расстралялі тады маглі за дробязь, — успамінае ён. — Знайшлі зброю — значыць, партызан. А я шмат зброі перадаў партызанам праз Храмянкова, ён быў наш сувязны з партызанскім атрадам. Зброю браў на месцы былых баёў, лазіў па акопах. Нават хаваў байцоў, бо яны ляжалі там, дзе загінулі. Некалькі гадоў таму дапамагаў пошукавікам шукаць абаронцаў.

## Софія была партызанскай сувязной

На жаль, дзе пахаваная сувязная партызанскага атрада Софія Андрэева і яе маці Марфа, невядома. Пра гэтых жанчын шмат чаго расказала Вольга Яўсеева, якой на час вайны было ўсяго дзевяць гадоў. Яшчэ падчас абарончых баёў дом, дзе яна жыла, а таксама дамы Бардзілоўскай і Окала-Кулак, якія стаялі побач, згарэлі ад снарада, які трапіў у іх. Людзі перасяліліся ў іншыя будынкі.

Жыхары вёскі Гаі кажуць, што іх чакаў лёс жыхароў Хатыні. І толькі дзякуючы савецкім агентам, якія інкогніта працавалі ў немцаў, бяду атрымалася адвесці. І Софія Веракса, і Вольга Яўсеева з удзячнасцю ўспаміналі агентаў з прозвішчамі Батура і Храмянкоў, казалі, што яны карысталіся ў немцаў аўтарытэтам і гэта дазволіла пазбегнуць бяды. На жаль, адзінкавыя ахвяры здараліся.

— Софію немцы схапілі падчас адной з аблаў, — расказвае Вольга Рыгораўна. — Яна збірала для партызан зброю, а калі даведалася, што немцы ў вёсцы, склала патроны ў вядро і панесла іх у раку Дубравенку. Немцы звярнулі на гэта ўвагу і схапілі яе. Яе трох сясцёр і пляменнікаў паспелі папярэдзіць, яны збеглі з дому. А вось маці была старая ўжо і засталася. Немцы абшукалі дом, знайшлі іншую зброю і скрыню толу за печкай. Старую жанчыну схапілі і таксама забралі ў гестапа. Больш іх жывымі ніхто не бачыў.

Вольга Яўсеева расказвае, што Софія вельмі актыўна супрацоўнічала з партызанамі. Яе не выратавала нават тое, што яна была цяжарная.

## На такіх прыкладах выхоўваецца патрыятызм

Дзякуй Мікалаю Талстых, члену грамадскага аб'яднання «Беларускае добраахвотнае грамадства аховы помнікаў гісторыі і культуры», які ахвяраваў сваім часам і на асабістым аўто арганізаваў паездку ў вёску Гаі. Прызнаецца, што для яго такія сустрэчы вельмі важныя.

— Ніводны сучасны гісторык не можа так праўдзіва і непрадузята расказаць пра канкрэтныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, як відавочцы, — кажа ён. — На жаль, з кожным годам іх становіцца ўсё менш. Таму вельмі важна, пакуль ёсць яшчэ магчымасць, як можна больш сабраць, захаваць і ўвекавечыць для нашчадкаў тыя факты, якія яны могуць данесці.

Навуковы супрацоўнік музея гісторыі Магілёва член абласной камісіі па справах увекавечання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Пётр Хаванскі перакананы, што сустрэчы дзяцей з такімі вось людзьмі, сведкамі ваеннага ліхалецця, як нішто іншае выхоўвае любоў і павагу да радзімы. Ён асабіста арганізоўвае паездкі для школьнікаў, якія задзейнічаны ў пошукавым руху.

— Наш доўг — не забыць імёны забітых мірных грамадзян, — кажа ён. — Вёска Гаі агэтуль захоўвае памяць пра Ядвігу Бардзілоўскую, а таксама маці і дачку Марфу і Софію Андрэевых. Пахаванне Бардзілоўскай мы паставілі на ўлік, а вось пытанне па апошніх адкрытае. Вельмі хацелася б і іх увекавечыць. Гэта трагедыя і боль вёскі Гаі. Жанчыны падтрымлівалі сувязь з партызанамі, дапамагалі ім, былі звязнымі. Памяць пра іх не павінна быць страчана. Хацелася б, каб іх прозвішчы трапілі на мемарыяльную пліту.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Вёска Гаі, Магілёўскі раён.*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### У тэму

**Алеся КУПЦОВА, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага раёна:**

— Бягучы год прысвечаны гістарычнай памяці, і гэта вельмі важна. Нашы дзеці — ужо тое пакаленне, якое амаль не бачыць ветэранаў вайны, не мае магчымасці размаўляць з імі. Без гэтага цяжэй уявіць, што адбывалася ў пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя. Мы павінны захаваць памяць пра тыя жахлівыя падзеі на нашай зямлі. Нездарма кажуць, што, калі забыцца пра вайну, яна можа паўтарыцца. Нам ні ў якім разе нельга забывацца, што не толькі салдаты, але і маленькія дзеці, жанчыны, старыя гінулі ад кулі акупанта. Такое нават уявіць страшна. Апошнім часам мы больш дэталёва вывучаем нашу ваенную гісторыю з дапамогай пошукавікаў. Кожны год адкрываюцца новыя факты і імёны. За апошнія пяць—сем гадоў наш раённы Савет ветэранаў адкрыў звыш адзінаццаці мемарыяльных дошак. Мы і надалей будзем улічваць новыя факты і абавязкова ўвекавечваць памяць пацярпелых ад рук акупантаў людзей.

Навінкі кнігарні

# Рамантык гісторыі

**Пасля сыходу з жыцця знакамітага беларусазнаўца, доктара філалагічных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Адама Мальдзіса пабачыла свет першая яго пасмяротная кніга — «Што было, што ёсць, што будзе з беларусамі?» (Мінск, «Энцыклапедыкс», 2022).**




Пад адной вокладкай сабраны артыкулы, эсэ, інтэрв'ю дасведчанага вучонага, краязнаўца, збіральніка памятак зямлі беларускай у галіне культуры. Назву кнізе дало адно з інтэрв'ю Адама Мальдзіса. Запамінальнай падаецца і даўняя гутарка з прафесарам, якую для часопіса «Беларуская думка» шмат гадоў таму зрабіў кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін. Прывядзём адказ на адно з пытанняў — пра тое, якімі былі вытокі ў фарміраванні творчай асобы беларускага культуролага: «— ...адразу пасля першых публікацый вырашылі стаць журналістам, займацца літаратурай?

— У дзяцінстве я марыў стаць астраномам. Нават пісаў ліст Ота Юльевічу Шміту. Адказаў мне не ён, а вельмі вядомы савецкі астраном Барыс Аляксандравіч Варанцоў-Вельямінаў. Ён напісаў, што мае думкі чыста рамантычныя, але цікавыя, і параіў працаваць у гэтым напрамку. Аднак бацька сказаў, што зоркі высока, а трэба думаць пра нешта зямное. А паколькі я пісаў у газету, то і паступаць трэба на журналістыку. І паступіў. Аддзяленне журналістыкі было тады на філфаку БДУ. Вучэбныя праграмы былі вузкаватыя, мала агульнагуманітарнай падрыхтоўкі, але ўменне хутка выказваць свае думкі — вельмі карыснае і прывітае мне вучобай ва ўніверсітэце. І ўсё ж я да гэтага часу шкадую, што лацінская мова ці стараславянская недастаткова вывучаліся. Калі я вучыўся ў аспірантуры Акадэміі навук, то адучуў гэты свой недахоп. Вядома, спрабаваў вывучаць самастойна, дарэчы, як і англійскую мову, бо ва ўніверсітэце вучыў нямецкую...»

Цяга да новых ведаў, да новых адкрыццяў кіравала Адамам Мальдзісам усё жыццё.

Нагадаем, што Адам Мальдзіс — аўтар многіх кніг па гісторыі літаратуры і культуры Беларусі, аўтар гістарычнай аповесці «Восень пасярод вясны», кнігі пра класіка беларускай літаратуры, з якім сябраваў некалькі дзесяцігоддзяў, — «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча».

Набыць навінку выдавецтва «Энцыклапедыкс» можна ў мінскай кнігарні «Акадэмкніга» па адрасе: Мінск, праспект Незалежнасці, д. 72.

**Сяргей ШЫЧКО.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 24 марта 2022 года проводит 6-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 66 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5435 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108607053, дв. 998227, 1986 г., 4 кат., 1216 км, электроагрегат АД-16У-Т/400 1ВП, № БТ3658СМВМ, 1986 г., 4 кат. | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 84 000,00 | 16 800,00 |
| 67 | Кабелеукладчик П-286 № 8640832 без основного оборудования (демилитаризованный) в составе: гусеничный тягач АТС-59Г БЛ-2 (демилитаризованное) № КВ0122БЛ ш. 11412429, дв. 7АЕ1226Е, 1986 г., *3 кат., 111 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 20 000,00 | 4 000,00 |
| 68 | Станция электропитания передвижная И-613М № 0532 в составе: - автошасси КАМАЗ-43106 ш. 004424, дв. 638261, 1990 г.; - кузов-фургон К-375 № 05196; - электроагрегат АСД-20-Т/230М2 № РН1443ДРНВ; - электроагрегат АСД-20-Т/230М2 № РН1443ДРАБ, 1990 г., *4 кат., 8028 км, 941 ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 25 000,00 | 5 000,00 |
| 69 | Станция электропитания передвижная И-613М № 0636 в составе: - автошасси КАМАЗ-43106 ш. 004366, дв. 637458, 1990 г., - кузов-фургон К1-375 № 07066; - электроагрегат АСД-20-Т/230М2 № ДК9411МТБА; - электроагрегат АСД-20-Т/230М2 № ДК9411МТТС, 1990 г., *4 кат., 3899 км, 986 ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 25 000,00 | 5 000,00 |
| 70 | Станция электропитания передвижная И-613М № 1798 в составе: - автошасси КАМАЗ-4310 ш. 0033529, дв. 0111738, 1987 г., - кузов-фургон К1-4320Д № 071407; - электроагрегат АСД-20-Т/230М2 № КК1432ММББ; - электроагрегат АСД-20-Т/230М2 № КК1432МПТК, 1987 г. *4 кат., 6425 км, 1735 ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 21 000,00 | 4 200,00 |
| 71 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) № 108312043, д. 849964, 1983 г., 4 кат., *1615 км* | н. п. Станьково, в/ч 25819 | 86 000,00 | 17 200,00 |
| 72 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) № 108511037, д. 963819, 1985 г., 4 кат., *4740 км* | н. п. Станьково, в/ч 25819 | 84 000,00 | 16 800,00 |
| 73 | Грузовой бортовой Урал-432020-01 ш. М0169013, дв. 750722, 1991 г., *4 кат., 62966 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 10 000,00 | 2 000,00 |
| 74 | Автомобиль ГАЗ-66-14 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: автошасси ГАЗ-66-14 ш. 0566812, дв. 128803, 1988 г., *4 кат., 3676 км,* кузов-фургон К-66Н № 0197789, 1990 г., *4 кат.* | г. Береза, в/ч 23324 | 4 880,00 | 976,00 |
| 75 | Автошасси Камаз-43105 ш. 006872, дв. 863155, 1986 г., *4 кат., 13081 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 12 600,00 | 2 520,00 |

